★ ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

№ 81 (1615) | Пятніца, 13 кастрычніка 1961 года | Цана 4 кап.

ЧЫТАЙЦЕ Ў СЁННЯШНІМ НУМАРЫ НАШАЙ ГАЗЕТЫ:

● НАСУСТРАЧ XXII З'ЕЗДУ КПСС. ВЕРШ П. БРОЎКІ, ПУБЛІЦЫСТЫКА А. МІРОНАВА. ТВОРЧЫЯ ПЛАНЫ РЭСПУБЛІКАНСКАГА ТЭАТРА ЮНАГА ГЛЕДАЧА. ● НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ ДЗЕЙНАСЦІ МАСТАЦКІХ АГІТБРЫГАД. ● АРТЫКУЛ А. АПАНАСЕНКІ АБ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ХАРЭАГРАФІІ. ● ЯКІМІ ПАВІННЫ БЫЦЬ УСТАНОВЫ КУЛЬТУРЫ. ● СУЧАСНАЯ ПОЛЬСКАЯ ПАЭЗІЯ. АРТЫКУЛ П. ГЛЕБКІ. ● НАВІНЫ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА ЗА МЯЖОЙ.

Пятрусь БРОЎКА

ЗА НАСТУПНЫМІ ГАДАМІ...

Дзень за днём і дні за днямі
Ўсё жыццё параінаачаць.
За наступнымі гадамі
Што я сэрцам чую, бачу —

Грамаду людзей шчаслівых,
Болей звонкі ў песнях голас,
Бег матораў больш руплівы,
Найспарнейшы хлебны колас.

Гарадоў дзівосных аркі —
У зялёным буйным лісці,
Неба сіні самай яркай
І ваду яшчэ празрысцей.

Дрэвы ў самым буйным цвеце,
Кветкі, быццам зоры тыя,
І галоўнейшае ў свеце —
Душы светлыя людскія.

Дзень за днём і дні за днямі
Нашу радасць у паходзе
Здабываць мы будзем самі,
Бо нішто так не прыходзіць.

Хтосьці зробіць дом на славу,
Хтосьці даль нябёс падлічыць,
Хтось даб'ецца лепшых сплаваў,
А хтось зерне павялічыць.

Хопіць працы і клапотаў
Збудавацца адмыслова,
Будзе кожнаму работа,
Мне ж—шукаць такое слова,

Каб яно свяціла ўночы,
Каб яго як сустракалі —
У людзей гарэлі вочы
І каб сэрцы ўсіх спявалі.

Адкрыцця XXII з'езда КПСС з вялікай і хвалюючай нецярплівасцю чакае літаральна кожны грамадзянін нашай неабсяжнай краіны. На гістарычным форуме будзе зацверджана новая Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, праграма пабудовы камуністычнага грамадства.

Тое, што яшчэ год назад многім з нас магло ўяўляцца далёкай будучыняй, сёння становіцца блізкай яваю: цяперашняе пакаленне савецкіх людзей будзе жыць пры камунізме! Толькі няпоўных сорак чатыры гады мінула пасля тых дзесяці дзён, якія скаланулі свет, а тое, да чаго заклікаў неўміручы Ленін, за што паміралі на франтах грамадзянскай вайны нашы бацькі і дзяды — вось яно, навокал нас, мы ствараем — і створым яго сваімі рукамі, сваёй воляй, сваёй натхнёнай працаю!

Я не буду гаварыць пра нечуваныя, велізарныя вяршыні росквіту ўсіх галін навукі, тэхнікі і культуры, якіх дасягне наша краіна ў бліжэйшыя дваццаць год. Гэта вядома і нам, і нашым сябрам ва ўсім свеце, і нашым лютым ворагам у імперыялістычных краінах. Але я не магу не сказаць пра чалавека, пра нашых людзей, пра нас саміх, каму — і стварацъ незлічоныя матэрыяльныя каштоўнасці бліжэйшай будучыні, і жыць пры камунізме. Не магу, таму што пра чалавека, як пра частку ўсяго народа, толькі і гаворыцца ва ўсім, ад першага да апошняга радка, праекце Праграмы КПСС.

Які ж цудоўны і які велічны ў сваёй душэўнай чысціні будзе наш савецкі чалавек у бліжэйшае дваццацігоддзе! «Цяпер,— гаварыў Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў на XIII з'ездзе ВЛКСМ,— калі наш народ узводзіць велічны будынак камунізма, мы не можам не думаць пра тое, якія будаўнікі прыйдуць нам на змену заўтра, каб завяршыць гэтае будаўніцтва». І партыя думае пра іх, партыя ўжо сёння выхоўвае такімі будаўнікамі ўсенароднага шчасця і радасці кожнага з нас.

Вось толькі адзін са шматлікіх, вядомых мне, прыкладаў такога выхавання, а больш правільна — перавыхавання радавога савецкага чалавека. Ёсць у мяне прыяцель, шафёр-самазвальшчык Пятро Булыгін. Разам са сваім цесцем, пенсіянерам-вадаправодчыкам Аляксандрам Піліпавічам Амяльяненкам ён на працягу некалькіх апошніх год будаваў уласны дом. Будавалі—ладзілі: «Жыць будзем душа ў душу, усё дабро папалам». А пабудавалі, абжыліся, — і пачалося: «Гэта не чапай, бо не тваё, а маё, ты тут прымак!»

— Пекла ў мяне, а не жыццё, — скардзіўся Пятро яшчэ ў мінулым годзе, — загрызаюць і мяне, і жонку, і дзяцей. Нават не разумею, адкуль у іх такая прагнасць!

Калі ж я намякаў яму: «А ты, маўляў, ці намнога лепшы? Бач, як чапляешся за ўласнасць», — ён маўчаў, рабіўся змрочны і адразу ж пачынаў гаворку пра іншае.

Так было аж да сёлетняга года, да апублікавання ў газетах праекта Праграмы КПСС. А прачытаў Пятро яго, уважліва пазнаёміўся з ім і нібы туман споўз з вачэй чалавека, цудоўны і неабсяжны свет раскрыўся перад ім. Быў у мяне з месяц назад, смяецца, рукі раскінуў так шырока, нібы ўвесь шар зямны гатовы абняць.

— Ты ж разумееш, — гаворыць, — пакуль трое маіх арлянят на свае ногі стануць, ім ніводная саломінка шляху ў жыццё засцілаць не будзе. Толькі працуй, — усё табе, ні ў чым не адмовяць. Вось, разумееш, як яно паварочваецца!

Прызнацца, не сцярпеў я, упікнуў сябра:

— А маёмасць твая як жа? Уласнасць?

— К чорту! — грымнуў ён дужай рукой па стале. — Навошта яна мне здалася? На мінулым тыдні гаварыў з дырэктарам аўтабазы, кватэру з двух пакояў у канцы года дадуць. Эх, і зажывём жа мы цяпер!

Вось, уласна, і ўся гісторыя, і самае прыкметнае, самае важнае ў ёй — словы Пятра: «Толькі працуй, — усё табе, ні ў чым не адмовяць». Так, ні ў чым адмовы не будзе. Хоча працаваць? Любімая праца ў яго ёсць. Хоча жыць у дастатку? Гэты дастатак дае і ў далейшым яшчэ больш дасць сумленная праца. Хоча паставіць на ногі траіх сваіх дзяцей? Алачка, старэйшая, з медалем скончыла дзесяцігодку і цяпер вучыцца ў педагагічным інстытуце, сярэдні, Валерка, — студэнт-другакурснік будаўнічага тэхнікума, самы малодшы, Юра, ходзіць у пяты клас.

Што ж яшчэ патрэбна Пятру Булыгіну? Маёмасць, з-за якой яны з цесцем сталі ворагамі? І ўспамінаюцца, нібы чую іх зноў, поўныя гнеўнай пагарды словы сябра: «Навошта яна мне здалася?!»

Праклён усяму, што засталося ў спадчыну нам ад далёкай, нядобрай мінуўшчыны: уласны дабрабыт за лік дабрабыту іншых, імкненне даць як мага менш, а атрымаць больш, несумленнасць у вялікім і малым, сквапнасць, кар'ерызм, дармаедства, хуліганства і п'янства! Усе гэтыя брыдоты, якімі б фігавымі лісткамі ні прыкрываліся яны, даўно ўжо сталі агіднымі для ўсяго савецкага народа. З імі і ў першую чаргу з імі, з рэшткамі гэтых агідных перажыткаў, вядзе наша партыя сёння жорсткую і непрымірымую барацьбу. І на баку партыі, разам з партыяй у гэтай гістарычнай барацьбе за новага чалавека выступае пераважная большасць усяго савецкага народа.

Вось чаму і нельга без вялікага хвалявання, без светлай радасці і душэўнага ўзрушэння чытаць тую частку праекта Праграмы КПСС, дзе гаворыцца аб чысціні і высакароднасці савецкіх людзей, аб гуманных узаемаадносінах і ўзаемнай павазе паміж імі. Бо чалавек чалавеку ў нашай краіне — сапраўдны сябра, таварыш і брат!

Ці трэба чакаць яшчэ дваццаць год для таго, каб зразумець жыццёвую сутнасць такой дружалюбнасці, таварыскасці і братэрства савецкіх людзей? Думаю — не, бо гэтыя рысы новага чалавека, гэтыя асаблівасці чалавека камуністычнага грамадства арганічна ўласцівыя мільёнам і мільёнам нашых людзей ужо сёння. Мы да канца, да апошняга свайго дыхання, адданы вялікай справе камунізма, горача і бязмежна любім сваю сацыялістычную Радзіму. Няма для нас большай радасці, чым натхнёная праца на карысць усяго народа. Няма для нас большых клопатаў, чым клопаты пра магутнасць і далейшы росквіт роднай краіны. Няма для нас большага гонару, чым быць вартымі сынамі і дочкамі свайго простага, сціплага, шчодрага і чалавекалюбівага народа. Такім імкнецца быць кожны з нас. Такімі мы выхоўваем сваіх дзяцей, усю нашу моладзь. Такімі і толькі такімі будзем мы ўсе.

Народы планеты ўслаўляюць Юрыя Гагарына і Германа Цітова за іх нечуваны подзвіг. І ўсе, хто бачыў герояў, хто чуў іх, захапляюцца сціпласцю, ветлівасцю, прывабнай дружалюбнасцю нашых навекі праслаўленых касманаўтаў. Мы пакуль не ведаем, хто будзе касманаўтам-тры, але мы цвёрда ўпэўнены ў тым, што і ён будзе толькі такі ж просты, сціплы, улюбёны ў сваю Радзіму сын народа, выхаваны партыяй камуністаў. Гераічнае і выключнае ў жыцці нашых людзей настолькі знітавалася са штодзённасцю, што часта цяжка бывае вызначыць, дзе канчаецца абыдзённае і дзе пачынаецца подзвіг. Бо не ў імя славы кідаецца ў палаючы дом школьніца-піянерка, а дзеля таго, каб, рызыкуючы сваім жыццём, вынесці з агню чужых дзяцей, якіх яна ні разу не бачыла. Не дзеля грашовай узнагароды аддаюць сваю кроў сотні і тысячы нашых донараў, а дзеля таго, каб вярнуць здароўе, выратаваць жыццё людзям, якіх яны, як правіла, не будуць ведаць ніколі. Не гонар, не кар'ерызм пасылаюць перадавікоў вытворчасці ў адстаючыя брыгады і на адстаючыя ўчасткі, а імкненне раз і назаўсёды пакончыць з якімі бы там ні было адставаннем на іх фабрыках, заводах, новабудоўлях, у іх калгасах і саўгасах. Прыемна гаварыць—«рамантыка асваення цаліны», але нават самыя нястрымныя з рамантыкаў, што паехалі на цалінныя землі, добра ведалі, якія часам непераадольныя цяжкасці чакаюць іх у бязлюдных, нікім не абжытых краях. Ведалі, і ўсё ж ішлі, і перамагалі, пераадольвалі ўсё, што сустракала іх там, дзе сёння прасціраюцца мільёны гектараў асвоеных палёў і дзе расце на радасць усяму народу новы горад, прыгажун Цалінаград!

Усё гэта, у сукупнасці, і ёсць тое самае важнае, самае галоўнае, аб чым мы думаем, калі гаворым пра чалавека камуністычнага заўтра. Ён і сёння сярод нас, гэты чалавек, пагоркаўску Чалавек з вялікай літары, які сваёй сціпласцю, любоўю да маці-Радзімы, сваёй самаадданай і высакароднай працай здзіўляе ўвесь свет. І калі я, радавы салдат маёй партыі, углядаюся ў яго ўжо бачныя рысы, мне хочацца ўсяго сябе да канца прысвяціць той велічнай мэце, шлях да якой вызначаны ў праекце новай Праграмы КПСС.

ТВОРЦА І ГЕРОЙ

Аляксандр МІРОНАЎ

СЕЯЦЬ ДОБРАЕ, ВЕЧНАЕ

Кожны дзень нашы тэатры, палацы, клубы шырока расчыняюць дзверы для моладзі, піянераў і школьнікаў, каб паказаць ім свае спектаклі, канцэрты. Нашы дзеячы сцэны сеюць многа цудоўных зерняў добрага і вечнага. Асабліва высакародныя пачуцці і хваляванні выклікаюць у гледачоў пастаноўкі, якія адлюстроўваюць жыццё, думы і справы сучаснікаў, стваральнікаў самага прыгожага жыцця на зямлі. А як прыемна і радасна для акцёраў, рэжысёраў, калі ўчынкі і словы іх герояў западаюць глыбока ў сэрцы моладзі!

Прагледжаны спектакль іншы раз запамінаецца надоўга, становіцца спадарожнікам на доўгія гады.

«Тры разы я глядзела спектакль «Крамлёўскія куранты», каб запомніць на ўсё жыццё любімы вобраз жывога Ільіча», — пісала ў школьным сачыненні піянерка Святлана Канойка.

Дапамагаць сваёй творчасцю ў фармаванні духоўнага аблічча будаўніка камунізма — ці можа быць больш велічнай задача для савецкага мастака!

Чым жа сустракае калектыў Тэатра юнага гледача XXII з'езд нашай Камуністычнай партыі? Над чым будуць працаваць нашы рэжысёры, акцёры, мастакі ў гэтым сезоне? Якімі думкамі і справамі жывуць яны сёння?

Выконваючы свае сацыялістычныя абавязацельствы, калектыў тэатра ў дружнай працы з драматургам І. Козелам падрыхтаваў спектакль «Канчане — суседзі мае». Праца была напружанай, але радаснай. Спектакль зацікавіў мінчан не толькі сваёй тэмай, жыццёвымі канфліктамі, сакавітай паэтычнай мовай, але і новым словам, якое сказаў аўтар аб людзях вёскі. Гэтыя людзі працуюць, змагаюцца за сваё шчасліва жыццё. Людзі Серабранкі — жыццярадасныя, аптымістычныя, з крылатымі марамі і смелым позіркам у будучыню. Праўда, на іх шляху трапляюцца яшчэ і такія, як Ярына і Андрэй Жыгліцкія, якія не хочуць ісці разам з усімі калгаснікамі па светлай дарозе. Яны трымаюцца абедзьвюма рукамі за сваю ўласнасць, за свой паркан, якім яны хочуць адгарадзіцца ад навакольнага жыцця. Праблема ўласнасці, праблема «майго» мае дачыненне да выхавання нашага падрастаючага пакалення. Гэта больш хвалюе нашых гледачоў, чым стылягі ў вузенькіх штоніках і з моднымі прычоскамі, якія так часта шпацыруюць па п'есах нашых драматургаў.

Другім новым спектаклем, які мы прысвячаем XXII з'езду КПСС, з'явіцца інсцэніроўка «Чырвоныя д'ябаляты», напісаная па вядомай баладзе П. Бляхіна аб першых героях — юных чырвонаармейцах грамадзянскай вайны. Спектакль ставіць рэжысёр Б. Дакутовіч.

Драматургі М. Алтухоў і Б. Бур'ян закончылі для нас п'есу «Зорка Венера» аб жыцці і творчасці выдатнага беларускага паэта Максіма Багдановіча. Пасля працы над «Рэвізорам» калектыў тэатра марыць ажыццявіць у новым сезоне складаную класічную камедыю «Клоп» Ул. Маякоўскага.

Мы павінны ужо сёння думаць пра спектакль, якім тэатр сустрэне 40-ю гадавіну піянерскай арганізацыі. Гэта дата будзе адзначацца ў маі 1962 года. У гонар слаўнага юбілею юных ленінцаў у Маскве адбудзецца фестываль дзіцячых тэатраў, у якім рыхтуецца прыняць удзел і наш калектыў. Драматург В. Зуб піша нам п'есу пра юнага героя Айчыннай вайны Марата Казея, якую мы пакажам у дні піянерскага свята.

Дзеці — наша будучыня, наша надзея. Аб дзецях, як нідзе, клапоцяцца ў нашай краіне. Аб гэтым гаворыцца і ў праекце Праграмы нашай партыі: «Забяспечыць шчаслівае дзяцінства кожнаму дзіцяці — адна з найбольш важных і высакародных задач будаўніцтва камуністычнага грамадства».

На жаль, у рэпертуары нашага тэатра ёсць толькі два спектаклі для малодшых класаў: «Прыгоды Чыпаліна» і «Казачны домік», якія прайшлі ўжо каля 200 разоў.

Мала робяць для дзяцей Тэатр імя Янкі Купалы і Рускі драматычны тэатр імя Горкага, якія нярэдка паказваюць на дзіцячых ранішніках такія спектаклі, як «Мільён за ўсмешку», «Хітравумная закаханая», «Дзень цудоўных падманаў» і інш.

Пачэснае месца ў нашым рэпертуары павінна заняць п'еса аб працоўным выхаванні моладзі і юнацтва.

«Праца на карысць грамадства — свяшчэнны абавязак кожнага чалавека». Гэтыя словы з праекта Праграмы нашай партыі гучаць як дэвіз для драматургаў і тэатраў.

Нашы новыя п'есы могуць быць рознымі па тэме і жанру, але яны абавязкова павінны быць глыбокімі па сваіх думках, яркімі па сцэнічных вобразах, характарах. Такія п'есы будуць натхняць рэжысёраў, акцёраў і мастакоў на стварэнне спектакляў, якія дапамогуць нашым юным гледачам ісці ў вялікае прыгожае жыццё.

Кажуць, што кожны чалавек у сваім жыцці павінен пасадзіць хоць адно дрэўца. А мне хочацца сказаць, што кожны савецкі пісьменнік і драматург павінен лічыць сваім гонарам — напісаць хоць адну п'есу для дзяцей і юнацтва.

У нашага тэатра сувязь з гледачом не спыняецца і пасля закрыцця заслоны. Спектакль працягвае сваё жыццё ў школе, на зборы атрада, камсамольскім сходзе, дзе яго часта абмяркоўваюць. Гэтыя абмеркаванні заўсёды праходзяць з хваляваннем. Хвалююцца гаспадары і госці. Карысць ад гэтых сустрэч відавочная і для стваральнікаў спектакляў і для гледачоў, якія вучацца выказваць свае думкі аб ігры акцёраў, працы рэжысёра, мастака.

Цікавая форма сувязі тэатра са школай — конкурсы сярод вучняў старэйшых класаў, якія пішуць сачыненні па прагледжаных спектаклях.

У тэатры праходзіць традыцыйны «Дзень настаўніка». У гэты дзень настаўнікі горада знаёмяцца з рэпертуарам тэатра, праглядаюць нашы новыя працы і абмяркоўваюць іх разам з акцёрамі і рэжысёрамі.

Пры тэатры ў новым сезоне будзе створан лекторый па эстэтычнаму выхаванню юных гледачоў, на якім будуць выступаць рэжысёры, мастакі, драматургі.

Тэатр юнага гледача добра разумее сваю задачу і адказнасць у эстэтычным выхаванні маладога пакалення. Мы шукаем і будзем шукаць новыя формы і метады ўдзелу ў гэтай вялікай справе.

Ул. СТЭЛЬМАХ,
дырэктар Тэатра юнага гледача.

Тэатр юнага гледача паказаў двухсоты спектакль па п'есе «Не верце цішыні». На здымку аўтар п'есы І. Шамякін сярод удзельнікаў 200-га спектакля.

СЭКАНОМІМ МІЛЬЁНЫ

КІНАФІКАТАРЫ НЯСВІЖСКАГА РАЁНА ПРАПАНУЮЦЬ

Савецкая дзяржава забяспечвае кінасетку разнастайнай, каштоўнай тэхнікай і фільмамі для абслугоўвання насельніцтва. Штогод выдаткуюцца вялікія дзяржаўныя сродкі. Нам, кінамеханікам і матарыстам, трэба па-гаспадарску, ашчадна ставіцца да гэтай тэхнікі, правільна яе эксплуатаваць.

Работнікі кінасеткі Нясвіжскага раёна, горача падтрымліваючы пачын калектываў прамысловых прадпрыемстваў Масквы, у гонар XXII з'езда КПСС уключыліся ў сацыялістычнае спаборніцтва за высокапрадукцыйнае выкарыстанне і выдатную эксплуатацыю кінатэхнікі, за павелічэнне тэрміну службы апаратуры, абсталявання, перасоўных электрастанцый і фільмаў, за выдатны паказ карцін насельніцтву.

Мы ведаем, што асноўнай умовай надзейнай работы кінаапаратуры з'яўляецца строгае выкананне правіл яе тэхнічнай эксплуатацыі.

Кожны з нас паставіў перад сабой мэту — падвоіць тэрмін службы дэталей апаратуры, ліквідаваць выпадкі зрыву сеансаў па тэхнічных прычынах.

У нашым раёне праведзены меры, накіраваныя на паляпшэнне эксплуатацыі тэхнікі і павышэнне якасці паказу кінафільмаў насельніцтву.

Значна пашырана сетка сельскіх стацыянарных кінаўстановак. Усе яны добра абсталяваны. Гэта дало магчымасць высакаякасна дэманстраваць кінафільмы.

Штогод сумесна з выканкомамі раённага і сельскіх Саветаў дэпутатаў працоўных мы праводзім агляды гатоўнасці месц кінапаказу да работы ў зімовых умовах. Пры абсталяванні апаратных стацыянарных кінаўстановак адразу робім у іх печы. У бягучым годзе нашы кінамеханікі і матарысты пабудуюць памяшканні для перасоўных электрастанцый пры ўсіх клубах, дзе ставяцца фільмы і няма пастаяннай электраэнергіі.

Майстар кінарамонтнага пункта раз у квартал праводзіць агляды і рамонт усёй перасоўнай кінапраекцыйнай апаратуры і электрастанцый. У вызначаны дзень кінамеханікі дастаўляюць апаратуру на рамонтны пункт. Разам з майстрам яны разбіраюць яе, робяць тэхнічны агляд, замяняюць спрацаваныя дэталі і рэгулююць. Такая сістэма агляду і рамонту пры добрым штодзённым доглядзе апаратуры кінамеханікамі і матарыстамі дазволіла раённаму аддзелу культуры адмовіцца ад утрымання чатырох камплектаў (якія належаць па норме) кінаапаратуры, прызначанай для падменнага фонду. За лік гэтага на дзвюх кінаўстаноўках мы ўстанавілі другія пасты і дадаткова ўвялі ў строй яшчэ дзве кінаперасоўкі.

Рамонт апаратуры, рухавікоў унутранага згарання і генератараў мы праводзім сіламі свайго рамонтнага пункта. Гэта значна скараціла выдаткі на рамонт тэхнікі.

Нас непакоіць тая акалічнасць, што на складзе аблкультрэмснаба часта адсутнічаюць неабходныя запчасткі, якасць некаторых дэталей вельмі нізкая. Мы звяртаемся да работнікаў забеспячэння з просьбай палепшыць забеспячэнне кінасеткі запаснымі часткамі і кінаматэрыяламі.

Мы пераканаліся, што праверка карцін з дапамогаю фільмаправершчыка не апраўдала сябе. Таму сёлета штатная адзінка фільмаправершчыка скарочана. Праверку фільмаў пры кальцавым забеспячэнні робяць самі кінамеханікі. Дастаўка карцін наладжана так, што кінамеханікі атрымліваюць фільмакопіі загадзя і маюць час праверыць іх да пачатку сеанса. Гэта зменшыла выдаткі на праверку фільмафонду, павысіла адказнасць кінамеханіка за карціну, якую ён атрымлівае. Мы лічым, што выпадкі псавання і дачаснага зносу фільмаў не павінны мець месца.

Барацьба за ўзорную эксплуатацыю кінатэхнікі, за павелічэнне тэрміну службы апаратуры і фільмаў цесна звязана з павышэннем кваліфікацыі механікаў і матарыстаў, ад ведаў якіх і іх адносін да працы ў многім залежыць тэрмін службы абсталявання і якасць кінапаказу. З гэтай мэтай у раёне сістэматычна праводзіцца тэхнічная вучоба, якая дапамагае кінамеханікам і матарыстам умела наладжваць сваю работу, правільна эксплуатаваць тэхніку. Нашы маякі — лепшыя кінамеханікі, якія працуюць у кінасетцы звыш васьмі — дзесяці год, пастаянна павышаюць свае веды. Усе кінамеханікі і матарысты раёна вырашылі на працягу года павысіць сваю кваліфікацыю на адну ступень.

Усё гэта дапамагае нам паляпшаць якасць паказу кіно, павышаць культуру кінаабслугоўвання насельніцтва, паспяхова выконваць фінансава-эксплуатацыйны план, значна зменшыць выдаткі, звязаныя з утрыманнем тэхнікі. План дзевяці месяцаў у раёне выканан па гледачах на 114,1 працэнта і па валаваму збору — на 113,5 працэнта. За тры кварталы кінасетка раёна зменшыла планавыя страты на 66,4 працэнта.

Мы глыбока перакананы, што калі работнікі кінасеткі ўсіх раёнаў нашай рэспублікі па-камуністычнаму будуць ставіцца да тэхнікі, то дзяржава наша сэканоміць мільёны рублёў.

У праекце Праграмы КПСС падкрэсліваецца, што культурнае развіццё ў перыяд разгорнутага будаўніцтва камуністычнага грамадства з'явіцца завяршаючым этапам вялікай культурнай рэвалюцыі. На гэтым этапе забяспечваецца стварэнне неабходных ідэалагічных і культурных умоў для перамогі камунізма. У сувязі з гэтым значна павялічваецца і колькасць кінаўстановак, а значыць і кінатэхнікі.

Мы прапануем яшчэ шырэй разгарнуць спаборніцтва за ўзорную эксплуатацыю кінатэхнікі, за павелічэнне тэрміну службы апаратуры і фільмаў.

Работнікі кінасеткі Нясвіжскага раёна: А. ПЛЕУСКІ — намеснік загадчыка раённага аддзела культуры па кіно, В. ЯЗВІНСКІ — майстар кінарамонтнага пункта, І. СЛОНІМСКІ, В. ХАЛОПІЦА, Л. КЛАУСЮК — кінамеханікі, П. ШАЦЬКО — матарыст.

У КНІГУ ГОНАРУ

На чарговым пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры БССР і прэзідыума БРК прафсаюза работнікаў культуры было разгледжана выкананне сацыялістычных абавязацельстваў, якія ўзяла ў гонар XXII з'езда КПСС Пліская раённая друкарня. 8 верасня калектыў гэтага прадпрыемства выканаў гадавы вытворчы план і пачаў працу ў лік 1962 г.

Калегія Міністэрства культуры БССР і прэзідыум БРК прафсаюза работнікаў культуры пастанавілі занесці ў Кнігу гонару калектыў работнікаў Пліскай раённай друкарні.

За паспяховае выкананне сваіх абавязацельстваў у гонар XXII з'езда КПСС у Кнігу гонару занесены лепшыя паліграфісты Віцебскай абласной друкарні.

За датэрміновае выкананне дзесяцімесячнага вытворчага плана ў гонар з'езда калектыў Віцебскай абласной друкарні ўзнагароджан Ганаровай граматай Міністэрства культуры БССР і БРК прафсаюза работнікаў культуры.

СПАДАРОЖНІКІ КАЛГАСНАГА ЖЫЦЦЯ

Цудоўна сказана ў праекце Праграмы КПСС: «З асяроддзя ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці вылучацца новыя таленавітыя пісьменнікі, мастакі, музыканты, артысты...»

І гэта сапраўды так. У нашых самадзейных драматычных, харавых, танцавальных, інструментальных калектывах — усюды не злічыць таленавітых людзей.

Вельмі вялікая ўвага надаецца мастацкай самадзейнасці, і гэта зусім зразумела. Але ёсць у ёй надзвычай важная галіна, пра якую чамусьці менш за ўсё клапоцяцца і яшчэ менш пішуць. Я маю на ўвазе мастацкія агітбрыгады—бадай самы любімы і аператыўны від самадзейнасці. У нашы дні дзейнасць мастацкіх агітбрыгад разгарнулася з асаблівай актыўнасцю. Іх выступленні могуць адбывацца на полі, у маленькім брыгадным клубе, на любой пляцоўцы, дзе толькі могуць размясціцца некалькі чалавек. Хто гэтыя людзі? Як правіла — энтузіясты культурна-масавай работы нашых раённых цэнтраў, лепшыя ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці ўсіх жанраў, якія самааддана падарожнічаюць па раёну. І ўсюды іх чакаюць, як дарагіх і жаданых гасцей. Гэта — не проста выканаўцы загадзя падрыхтаваных нумароў, а ў большасці—імправізатары, стваральнікі надзённых твораў. Прыехаўшы ў той ці іншы калгас, яны знаёмяцца з людзьмі, іх справамі, добрымі і благімі, і на матэрыяле канкрэтнага жыцця пішуць фельетоны, інтэрмедыі, жарты, частушкі, песні.

Так, напрыклад, працуе мастацкая агібрыгада пры Слонімскім РДК. У яе склад уваходзяць артысты Слонімскага народнага тэатра, самадзейныя спевакі, танцоры і інш. Самадзейны кампазітар і паэт Міхаіл Гарабец і артыст народнага гэатра Віктар Усавік самі пішуць на мясцовыя тэмы частушкі і музыку да іх. Гэта заўжды з'яўляецца самым цікавым у праграме брыгады. Асаблівай папулярнасцю ў калгаснікаў карыстаецца песня М. Гарабца «Слонімская лірычная», якую выконвае выкладчык музычнай школы Ул. Кавальчук. Шчыра сустракаюць калгаснікі самадзейнага спевака А. Іванчанку, былога семінарыста, які парваў з цемрашаламі і выкрывае іх цяпер. Нярэдка бываюць выпадкі, калі ўдзельнікі агітбрыгады перад выступленнем працуюць разам з калгаснікамі на фермах, у полі, натхняючы сялян сваім прыкладам. Вось чаму творы, напісаныя па гарачых слядах жыцця, карыстаюцца вялікім поспехам.

Характэрна яшчэ тое, што ў гэтых творах асноўная ўвага надаецца паказу станоўчага ў рабоце і жыцці калгаснікў. У іх няма смакавання адмоўнага, няма абывацельскага зубаскальства.

Мастацкія агітбрыгады Слуцкага, Рагачоўскага, Бабруйскага, Брагінскага, Старадарожскага раённых дамоў культуры таксама шырока выкарыстоўваюць у сваім рэпертуары сатырычныя сцэнкі, пародыі, інтэрмедыі, куплеты, частушкі, песні на мясцовыя тэмы.

— Мы хочам, каб кожны факт, уключаны ў праграму, — гаворыць кіраўнік агітбрыгады Слуцкага раённага Дома культуры Генадзь Гапановіч, — выклікаў у гледача думку, што жыць і працаваць трэба яшчэ лепш.

Ці трэба да гэтага дадаваць, што факты жыцця, якія падбіраюцца для канцэрта, мусяць быць праўдзівымі і мець канкрэтны адрас. Толькі тады яны будуць хваляваць гледача і навядуць яго на роздум.

Агітбрыгада вядзе агітацыйную і прапагандысцкую работу ў самых разнастайных формах і выкарыстоўвае ўсе прыёмы палітычнай агітацыі (лекцыі, палітычныя гутаркі і інш.). Арганічна звязваецца з імі мастацкая прапаганда, створаная на канкрэтным жыццёвым матэрыяле. Аднак асноўнае ў працы брыгады — мастацкая частка, якая ў арганічным адзінстве спалучаецца з рознымі формамі масава-палітычнай і культурна-асветнай працы.

Па такому прынцыпу працуе і агітбрыгада Рэчыцкага гарадскога Дома культуры. Цяпер яна стварае тэатралізаваны агляд «Вясёлы спадарожнік», дзе будзе шмат сатырычных тэкстаў песень, напісаных на вядомыя папулярныя мелодыі і прысвечаных канкрэтным асобам.

Бадай, самая папулярная ў рэспубліцы — мастацкая агітбрыгада Прысынкаўскага сельскага клуба Уздзенскага раёна, якую ўзначальвае заслужаны дзеяч культуры БССР Павел Іванавіч Шыдлоўскі. Ён піша вершы, частушкі, песні і музыку да іх. Агітбрыгада мае дзве цікавыя праграмы: «На калгасных палях любім мы працаваць» і «Партыя, заўсёды з табой». Частушкі і песні, створаныя Паўлам Іванавічам, хутка падхопліваюцца калгаснікамі. Яны доўгі час жывуць і аказваюць свой уплыў на тых, каму адрасаваны.

Удзельнікі многіх агітбрыгад рэспублікі любяць сатыру, вясёлыя гумарыстычныя нумары. Але ці толькі імі трэба займацца? Так, напрыклад, агітбрыгада Клімавіцкага раённага Дома культуры працуе над тэатралізаваным аглядам «Несцерка ў калгасе», дзе ўжываюцца не толькі сатырычныя куплеты, пародыі, гумарыстычныя сцэнкі, а і лірыка, пафас, простыя сяброўскія словы аб лепшых людзях — маяках калгаса.

Лепшыя агітбрыгады рэспублікі клапоцяцца аб ідэйна-мастацкай якасці рэпертуару, яго надзённасці і правільнай тэматычнай накіраванасці. Вопыт работы такіх агітбрыгад, як слонімская, рагачоўская, слуцкая, рэчыцкая, паказвае, што найбольшае выхаваўчае значэнне і разам з тым поспех у гледачоў маюць праграмы ці агляды, складзеныя на канкрэтным матэрыяле. Праўда, не ў кожнай брыгадзе ёсць людзі, здольныя напісаць частушку, фельетон, інтэрмедыю. У такіх выпадках лепш пакуль карыстацца гатовым рэпертуарам. Але ў кожным калгасе сёння можна знайсці сярод сельскай інтэлігенцыі або вучняў чалавека, здольнага памагчы агітбрыгадзе.

Тэматычная накіраванасць, цэласнасць патрабуецца ад рэпертуару мастацкіх агітбрыгад. Але гэта не азначае, што, напрыклад, у час уборачнай кампаніі вершы, інтэрмедыі павінны расказваць толькі аб уборцы, на вечары жывёлаводаў — толькі аб жывёлаводах. У тэматычны канцэрт агітбрыгады ўключаюцца і гераічныя, і лірычныя, і жартоўныя творы, беларускія народныя песні і танцы — усё гэта ўзбагачае праграму, робіць яе больш змястоўнай.

Некаторыя брыгады маюць ужо свой творчы актыў, які вывучае матэрыялы, апублікаваныя ў друку, становішча спраў раёна, калгаса, саўгаса, вёскі, цікавіцца жыццём і бытам калгаснікаў, механізатараў, сельскай інтэлігенцыі. Шкада, што не ўсе агітбрыгады ўстанавілі цесную сувязь з літаб'яднаннямі, рэдакцыямі раённых газет, з прафесіянальнымі аўтарамі. А гэта было б карыснай дапамогай у іх працы.

Агітбрыгады — форма мастацкай самадзейнасці, якую нарадзіла наша цудоўнае, кіпучае жыццё. З кожным днём у рэспубліцы становіцца іх больш і таму ўвага да іх таксама павінна быць большай. А пакуль што праца брыгад у многіх месцах ідзе самацёкам. Абласныя і раённыя арганізацыі яшчэ мала цікавяцца іх дзейнасцю. І не дзіва, што, напрыклад, у Гомельскай вобласці работа мастацкіх агітбрыгад доўгі час была ў заняпадзе.

Цяпер у рэспубліцы пачалі працу дзесяцімесячныя курсы падрыхтоўкі кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці. Думаецца, што ў планы работы гэтых курсаў трэба было б увесці вывучэнне вопыту работы мастацкіх агітбрыгад як асобную дысцыпліну. Будучых кіраўнікоў трэба навучыць працаваць над частушкай, песняй, сцэнкай, інтэрмедыяй і ўсім іншым, што датычыцца малых форм. Пажадана пазнаёміць і з рэжысурай выступленняў агітбрыгад, з умовамі выкарыстання форм наглядной агітацыі, з мастацкім афармленнем і іншым.

У снежні гэтага года ў Мінску будзе праведзен рэспубліканскі агляд мастацкіх агітбрыгад. Цяпер у раёнах і абласцях ідзе актыўная падрыхтоўка да гэтага вельмі важнага мерапрыемства. Рэспубліканскі агляд будзе значным штуршком у рабоце агітбрыгад і бясспрэчна выявіць шмат талентаў у гэтай патрэбнай галіне мастацкай самадзейнасці.

А. РАДЗІВІЛАЎ,
метадыст Рэспубліканскага Дома народнай творчасці.

НАРОДНАЯ ХАРЭАГРАФІЯ І СУЧАСНАСЦЬ

«Галоўная лінія ў развіцці літаратуры і мастацтва, — гаворыцца ў праекце Праграмы КПСС, — умацаванне сувязі з жыццём народа, праўдзівае і высокамастацкае адлюстраванне багацця і мнагастайнасці сацыялістычнай рэчаіснасці, натхнёны і яркі паказ новага, сапраўды камуністычнага, і выкрыццё ўсяго таго, што перашкаджае руху грамадства наперад».

Вось яна, канкрэтная і ясная праграма творчай дзейнасці для ўсіх работнікаў савецкага мастацтва — мастакоў, кампазітараў, харэографаў, дзеячоў тэатра і кіно. Наша Камуністычная партыя клапоціцца пра тое, каб усе віды мастацтва развіваліся ў шырокім рэчышчы народнасці і рэалізму, праўдзіва паказвалі жыццё людзей і грандыёзныя падзеі сацыялістычнай эпохі.

Як раскрыць сродкамі народнай харэааграфіі рысы герояў-сучаснікаў, як адлюстраваць у танцавальных творах прыгажосць і веліч сённяшняга дня, багатага выдатнымі справамі савецкага народа — вось тое, што хвалюе малады калектыў Дзяржаўнага ансамбля танца БССР і над чым ён цяпер настойліва працуе.

Харэаграфія — адзін з самых багатых і складаных відаў мастацтва. Беларускае танцавальнае мастацтва, з якім непасрэдна звязана творчасць ансамбля, мае багатыя традыцыі, яно трывала звязана з мінулым і цяперашнім народа, яго гісторыяй, бытам і норавамі. На жаль, асобныя пастаноўшчыкі ў рэспубліцы, працуючы над сцэнічным увасабленнем лепшых узораў народнай харэаграфіі, часта цалкам не захоўваюць нацыянальны каларыт, жыццярадаснасць, паэтычнасць, гумар, прыгажосць і энергію; якія ўласцівы танцам беларускага народа. У беларускім танцавальным мастацтве мала адлюстраваны героіка і патрыятызм савецкіх людзей, тэмы партызанскага руху ў перыяд Айчыннай вайны, тэмы мірнага стваральнага жыцця і працы герояў-сучаснікаў.

Калектыву ансамбля, нягледзячы на тое, што ён такі яшчэ малады, даводзіцца па сутнасці першаму ў рэспубліцы распрацоўваць многія з гэтых актуальных тэм і мастацкіх задум, за ажыццяўленне якіх раней мала хто браўся. Стварэнне новых танцавальных пастановак на аснове сучаснага матэрыялу — гэта цяпер стала галоўным творчым напрамкам у працы ансамбля. І таму крыўдна, калі сёй-той з крытыкаў замест таго, каб падтрымаць творчы калектыў за яго пошукі новых сцэнічных форм у харэаграфіі, спрабуе ўзяць пад сумненне некаторыя нашы сучасныя работы і папракнуць у несамастойнасці іх пастановачнага вырашэння.

Так, у артыкуле С. Грабеншчыкава «На сцэне — беларускі танец» («Літаратура і мастацтва» № 51, 1961) наш ансамбль крытыкаваўся за тое, што пастаўлены ім «Лянок» быццам «ні што іншае, як перанос на беларускую музыку сцэнічнага варыянта ўкраінскага танца «Лянок». Такое сцверджанне не адпавядае сапраўднасці. Гэты паэтычны і маляўнічы народны танец шырока бытуе на Палессі, на мяжы дзвюх братніх рэспублік, Украіны і Беларусі, дзе песенна-танцавальны фальклор мае шмат агульных рысаў і мала чым адрозніваецца адзін ад аднаго. Мы ўзялі запіс твора народнай харэаграфіі і надалі яму прафесіянальную сцэнічную форму, новае сучаснае гучанне. У чым жа яно выражаецца?

Раней вырошчванне і апрацоўка ільну, выраб з яго гатовай прадукцыі вяліся ручным спосабам. Цяпер жа на змену ручной працы прыйшлі сельскагаспадарчыя машыны, ткацкія аўтаматычныя станкі. Вось гэтыя змены, мы пастараліся адлюстраваць сродкамі харэаграфіі ў танцы «Лянок». Асабліва характэрная, як нам здаецца, другая яго палавіна, якая па задуме павінна раскрываць працэс пераапрацоўкі ільну і выраб з яго на фабрыцы прыгожых ільняных вырабаў. Нашы хлопцы з ансамбля ўмоўна адлюстроўваюць у танцавальнай сцэнічнай форме ткацкі станок, а дзяўчаты — маткі нітак, якія, праходзячы праз станок, утвараюць гатовую хустку надзвычай прыгожага колеру. Завяршаецца «Лянок» вясёлым танцавальным фіналам, у якім выкарыстаны рухі беларускіх кадрылі, полькі і іншых народных танцаў. Дзіўна, як можна гаварыць, што гэта не беларускі харэаграфічны твор і што ён запазычаны ў іншага народа.

Зусім новую сцэнічную рэдакцыю атрымала ў пастаноўцы нашага ансамбля вядомая беларуская «Бульба». На аснове старых народных традыцый мы стварылі сучасны сюжэтны танец, у якім б'ецца пульс сённяшняга жыцця, іскрыцца радасць калгаснай працы. У гэтым танцы мы стараліся паказаць не толькі сяброўскія калектыўныя ўзаемаадносіны паміж сельскімі працаўнікамі, якія цяпер лёгка кіруюць трактарам і камбайнам, але і паказаць таксама духоўны рост калгаснікаў, іх жаданні прыгожа і з густам апранацца, пашырыць свой культурны кругагляд. Касцюмы ў нашых танцораў для «Бульбы», зробленыя з багатым народным арнаментам, вабяць сваёй прыгажосцю і выразнасцю. Магчыма, не адна маладая калгасніца, калі ўбачыць гэтыя касцюмы на артыстах ансамбля ў час канцэрта, прыйшоўшы дадому, скажа: «Трэба і сабе пашыць такую ж кофту і спадніцу, вельмі ж яны прыгожыя!..»

Вось мы і дамагаемся іменна такой дзейснай прапаганды сярод шырокіх мас не толькі нацыянальнага харэаграфічнага мастацтва, а і сучаснага беларускага касцюма.

Гаворачы пра новыя сцэнічныя прынцыпы ў працы нашага ансамбля, пра тое, як мы апрацоўваем многія старадаўнія народныя танцы, узнімаючы іх да ўзроўню сучаснага гучання, я яшчэ хачу спыніцца на пастаноўцы «Беларускай рапсодыі». Яна складваецца з некаторых матываў і асобных элементаў старажытнага «купальскага святкавання». Аднак мы зусім адышлі ад рэлігійнай абраднасці, зусім адмовіліся паказваць на сцэне сам момант варажбы дзяўчат ля ракі ў ціхую ліпеньскую ноч, кідання імі з душэўным узрушэннем вянкоў на ваду ў спадзяванні выражыць сабе шчасце. Праўда, і цяпер вясковыя дзяўчаты таксама любяць віць з палявых кветак вянкі, не забываюць спяваць старадаўнія песні і вадзіць на лясных палянах карагоды. Але ў наш час ад ранейшага абраду не засталося і следу, ён ператварыўся ў масавае вясёлае маладзёжнае свята. Вось такое свята і паказана ў «Беларускай рапсодыі»: прасякнутай паэзіяй радасці і шчасця савецкага юнацтва.

Работа над творчым пераасэнсаваннем, узбагачэннем старадаўніх народных танцаў і стварэннем новых пастановак на тэмы савецкай рэчаіснасці працягваецца ў ансамблі з вялікай любоўю і настойлівасцю. XXII з'езду нашай партыі мы прысвяцілі сваю «Калгасную ўраджайную», а цяпер на чарзе — пастаноўкі «Беларускай партызанскай», «Кадрылі», не гаворачы ўжо аб творах братніх рэспублік.

У чым жа відаць узаемасувязь і ўзаемаўзбагачэнне паміж танцамі розных народаў, і ў якой меры ўплывае адна танцавальная культура на другую? На мой погляд, С. Грабеншчыкаў памыляецца, калі ў сваім артыкуле рэкамендуе запазычваць у іншых народаў танцавальныя рухі і нават кампазіцыйную пабудову фальклорных твораў, надаючы ім характар і нацыянальную афарбоўку таго ці іншага народа. У кожным народзе харэаграфічны фальклор складваўся стагоддзямі, таму яго трэба старанна аберагаць. Гэта багаты і каштоўны матэрыял для працы балетмайстраў і харэографаў.

Усім вядома, што славянскія народы, асабліва рускія, беларусы і ўкраінцы, знаходзяцца паміж сабою ў вялікім сваяцтве і маюць агульныя рысы не толькі ў мове і звычаях, але і ў танцавальным мастацтве, музыцы і песнях. Аднак гэта зусім не азначае, што мы, скажам, можам узяць нейкія рухі або элементы з украінскага танца і механічна перанесці іх у беларускі. Я ніколі не мог бы стаць на такі няправільны творчы шлях, гэта супярэчыла б маім поглядам на ролю і ўзаемаўплыў твораў мастацтва розных народаў у нашым сацыялістычным грамадстве. Я лічу што невычэрпныя багацці беларускага танцавальнага фальклору трэба ўсяляк захоўваць і развіваць у духу сённяшняга дня.

Кожны балетмайстар, не толькі прафесіянальны, але і той, што працуе з самадзейнасцю, павінен добра ведаць жыццё народа, яго звычаі і прывычкі, знаёміцца з народнымі паданнямі, легендамі і адзеннем. А калі ён прыступае да пастаноўкі новага танца, павінен мець перад сабой ясную творчую задуму і перадаць яе кампазітару — аўтару будучай танцавальнай музыкі. Балетмайстру неабходна мець высокую культуру і спецыяльныя веды, ён абавязаны добра разбірацца ў музыцы і літаратуры, быць сапраўдным мастаком, які, убіраючы ў сябе ўсё добрае, павінен адмятаць усё дрэннае. На жаль, за пастаноўку танцаў у нас часта яшчэ бяруцца не кампетэнтныя людзі, не спецыялісты сваёй справы. З такімі фактамі можна сустрэцца не толькі ў мастацкай самадзейнасці, але і на прафесіянальнай сцэне.

Каб танцавальны фальклор не траціў сваёй самабытнасці і прыгажосці, трэба яго збіраць і даследаваць. Аднак спецыяльнай арганізацыі, якая гэтым займалася б, у нас да гэтага часу няма, пра што, дарэчы, піша ў «Советской культуре» і народная артыстка РСФСР Н. Надзеждзіна. Якая, напрыклад, карысць з таго, што, па словах С. Грабеншчыкава, у Рэспубліканскім Доме народнай творчасці сабраны і захоўваюцца 37 запісаў фальклорных танцаў? На аглядах мастацкай самадзейнасці іх не ўбачыш, таму што ўсе гэтыя запісы ні кім не даследуюцца і не папулярызуюцца. С. Грабеншчыкаў у сваім аргыкуле многа месца аддаў непатрэбным тлумачэнням гісторыі ўзнікнення маладзёўскай «Сырбы» і нічога канкрэтнага не сказаў пра тое, як узніклі тыя 37 фальклорных запісаў, якія цяпер ляжаць нерухома ў Доме народнай творчасці.

Улічваючы такое ненармальнае становішча з запісам і вывучэннем твораў народнай харэаграфіі, мы хочам стварыць пры ансамблі своеасаблівы цэнтр па збору і выяўленню лепшых узораў танцавальнага фальклору. У нас арганізуецца спецыяльная група з некалькіх кінааператараў, якая пад кіраўніцтвам харэографа будзе ў час гастрольных паездак ансамбля па рэспубліцы шукаць і здымаць на кінаплёнку ўсё лепшае і самабытнае з народнай творчасці, пачынаючы з танцаў і канчаючы цікавымі маладзёжнымі гульнямі, сцэнкамі, адзеннем. У стварэнні фондаў фальклорных матэрыялаў па гісторыі беларускай танцавальнай культуры нам могуць вялікую паслугу аказаць кіраўнікі самадзейных калектываў рэспублікі.

У Беларусі ёсць вялікая армія ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці, значная частка якіх аддае свае сілы развіццю танцавальнага мастацтва. На адным з раённых аглядаў Мінскай вобласці мяне да глыбіні душы ўсхвалявала і ўзрадавала выступленне чатырох пажылых калгаснікаў, якія праз дзесяцігоддзі пранеслі і захавалі ў некранутым выглядзе сапраўдную беларускую народную «Кадрылю», якая для нас, прафесіянальных балетмайстраў, з'яўляецца каштоўным матэрыялам пры стварэнні новых сучасных танцаў.

Вялікай увагі заслугоўвае дзейнасць кіраўніка народнага самадзейнага ансамбля песні і танца Гомельскага Палаца культуры імя Ул. І. Леніна народнага артыста БССР А. Рыбальчанкі. Сваёй шматгадовай працай у самадзейнасці ён унёс вялікі ўклад у развіццё нацыянальнага харэаграфічнага мастацтва. Гэта сапраўды народны харэограф, у якога могуць павучыцца і многія прафесіянальныя балетмайстры. А. Рыбальчанка з поспехам паставіў у нашым калектыве «Лявоніху», поўную весялосці і жыццярадасных пачуццяў.

Я звяртаюся з просьбай да іншых кіраўнікоў танцавальных гурткоў: прыязджайце да нас у ансамбль падзяліцца сваім вопытам, накопленым творчым багажом, прывозьце з сабою новыя запісы фальклорных танцаў, а мы ў сваю чаргу дапаможам вам сваімі парадамі, пазнаёмім з новымі мастацкімі прынцыпамі нашай работы. Такая сувязь узаемна ўзбагаціць прафесіянальнае і самадзейнае мастацтва і прынясе нам агульную карысць. Давайце сумеснымі намаганнямі рухаць танцавальную культуру беларускага народа па шляху яе далейшага развіцця і сапраўднага мастацкага ўдасканалення. Давайце шукаць новыя формы сцэнічнай пастаноўкі танцаў і ствараць творы пра наша гераічнае сёння, каб яны служылі крыніцай радасці і натхнення для мільёнаў савецкіх людзей.

А. АПАНАСЕНКА,
заслужаны дзеяч мастацтва БССР, мастацкі кіраўнік і галоўны балетмайстар Дзяржаўнага ансамбля танца БССР.

Хор сельгасарцелі «Расія» добра вядомы ў Шчучынскім раёне. Шмат разоў ён паспяхова выступаў перад працаўнікамі раённага цэнтра і суседніх калгасаў. Пастаяннай удзельніцай канцэртаў гэтага самадзейнага калектыву была маладая калгасніца Марыя Сыч. Сёлета праўленне арцелі накіравала яе на вучобу ў Гродзенскае музычна-педагагічнае вучылішча. Тут Марыя паспяхова займаецца па класу баяна. Пройдзе некалькі год, і яна вернецца ў родны калгас добрым музыкантам-педагогам.

На гэтым здымку вы бачыце, як выкладчык З. Пятроўская вядзе заняткі з Марыяй Сыч.

Фота Ч. Мезіна. (БЕЛТА).

БОЛЬШ ХВАЛЯВАННЯ І ЦЕПЛЫНІ

Есць у кнізе Ул. Мехава «Помнік герою» добрыя, вартыя ўвагі апавяданні. Вось, напрыклад, лепшае з іх — «Чаравікі». Аўтару ўдалося даволі пераканаўча намаляваць вобраз галоўнага героя — Феліка. Гэта энергічны, дапытлівы юнак-камсамолец, для якога няма ў жыцці больш запаветнай мары, акрамя як «паадкручваць галовы сусветнай контрэвалюцыі»... Фелік адзін з тых, хто ўзводзіў Магнітку і Камсамольск-на-Амуры. Пісьменнік дакладна перадае каларыт часу, выключную сціпласць сваіх герояў — камсамольцаў 30-х гадоў. Чытач палюбіць Феліка, ён зразумее яго шчырыя, хоць крыху і наіўныя перажыванні. Фелік саромеецца сваёй цёткі, баіцца, каб яму не напомнілі, што ён сын інтэлігента, адмаўляецца насіць модныя бацькавы чаравікі, хоць боты яго зусім разлезліся.

Цішком ад цёткі ён абменьвае чаравікі на звычайныя салдацкія бацінкі з абмоткамі. І чытачу зразумела яго здзіўленне, калі ён убачыў гэтыя ж чаравікі на нагах у сакратара гаркома...

Апавяданне напісана цёпла, усхвалявана, яго сагравае дасціпны аўтарскі гумар. Усе героі апавядання маюць свой выразны, адметны твар. Нават шавец, эпізадычны герой на старонках твора, зусім жывы і пераканальны. Трапна знойдзеная дэталь («паправіў акуляры, **прывязаныя да вуха канцом дратвы»)** дапамагае стварыць закончаны вобраз, нават характар.

Удача напаткала пісьменніка і ў эцюдзе «Салаўі».

Аўтар нічога не гаворыць аб тым, як стаміліся людзі ад кровапралітнай бойкі, як праглі яны мірнага жыцця і стваральнай працы, як збаляліся іх сэрцы ад доўгага чакання зноў вярнуцца ў родны кут. Пра ўсё гэта ён сказаў адной фразай: «Гэта было пад канец грамадзянскай вайны...» Агульны настрой перададзен праз вобраз камандзіра, які са сваім эскадронам праходзіць каля родных мясцін. Сціскаецца сэрца ад невыказнага хараства аздобленых першай зелянінай дрэў. Дзе ён толькі не быў з таго часу, як пайшоў пад галашэнне маці на мікалаеўскую вайну! Але нідзе не было так добра, як тут, на роднай Беларусі...

І так крыўдна і балюча стала эскадроннаму за сваіх байцоў, што ад зморанасці схілялі галовы на грывы коней, так захацелася яму ўсяліць ім добры настрой, перадаць прыгажосць роднага краю, што не стрымаўся — сярдзітым шэптам падаў каманду: «Эскадрон, смірна! Усім слухаць салаўёў!».

І шкада, што ў канцы аўтар быццам страціў пачуццё мастацкага густу: апошняя кропка пастаўлена позна, і ў апавяданні атрымаўся непатрэбны даважак.

Падобная непатрабавальнасць часта шкодзіць пісьменніку там, дзе ён, здавалася б, ішоў па вернай і правільнай дарозе. Захапіўшыся прыдуманай схемай, пісьменнік часам запаўняе яе ўвогуле правільнай, але халоднай аргументацыяй.

Вось апавяданне «Помнік герою». Узяўшы за аснову даволі займальны сюжэт, пісьменнік не здолеў надзяліць сваіх герояў характарамі, не здолеў паказаць іх жывымі людзьмі. Атрымаліся яны нейкімі прамалінейна-стандартнымі: добрымі, сумленнымі, акуратнымі. І гэта пазбавіла твор жывасці, цеплыні. Некаторыя мясціны апавядання нагадваюць звычайныя газетны нарыс.

Апавяданне «Басконская хата» — пра юнака, які страціў радзіму ў Іспаніі і знайшоў яе ў Савецкім Саюзе, магло б атрымацца лепшым, калі б пісьменнік надзяліў герояў глыбейшым унутраным жыццём. Апавяданне загрувашчана лішнімі і мала цікавымі падрабязнасцямі.

У кнізе часта можна сустрэць нязграбныя выразы («пахудзелы і пастарэлы», «вакол узнікалі карагоды», «размаўлялі яны, прыходзячы да настаўніка»), і калькі з рускай мовы («цяжка будзе ўстанавіць, каму ён калісьці належаў») і інш.

Хочацца пажадаць пісьменніку быць больш патрабавальным да сваёй творчасці. Нельга пісаць для дзяцей суха, хоць і дакладна, без агеньчыку, хоць і праўдзіва.

І. ПАЎЛЮКОЎСКІ.

ЁН БЫЎ ПІЯНЕРАМ

«... На Юркавы плечы ляглі цяжкія, як свінец, рукі. Ён увагнуў галаву, паспрабаваў падняцца.

— Сядзі, — з пагрозай прагучала над вухам, — і калі пікнеш — во! — перад вачыма цьмяна бліснула шырокае лязо кінжала.

— Што вам трэба?! — рвануўся Юрка. Але рукі трымалі яго моцна, быццам сталёвыя ціскі.

— Слухай наш прысуд! — голас гучаў хрыпла, са свістам.

«Чый гэта голас?»—мільганула думка. І тут жа Юрка ўспомніў: — «Дзед Гаўрыла!».

А голас працягваў:

— Ты, шчанё, бальшавіцкі вырадак, і табе не месца на зямлі. Дык хай збудзецца божая кара...

З усяе сілы рвануўся Юрка, хацеў крыкнуць, паклікаць на дапамогу, але так і не змог. Нешта цяжкае апусцілася яму на галаву. У вачах асляпляльна бліснула, і ён паляцеў кудысьці ў чорнае бяздонне...».

Так абарвалася жыццё піянера Юркі Сасноўскага, які загінуў ад рукі ворагаў Савецкай улады.

«Круглы год шумяць над Юркавай магілай высокія клёны. З пакалення ў пакаленне будзе перадавацца быль пра яго кароткае, але яркае жыццё», — так заканчваецца аповесць Я. Курто «Ён быў піянерам».

Нягледзячы на трагічны лёс героя, аповесць аптымістычная, прасякнутая верай у перамогу калгаснага ладу жыцця. Яна багатая па зместу і чытаецца з цікавасцю.

Звяртае на сябе ўвагу мова твора — жывая і каларытная. Аўтар імкнецца данесці да чытача тую напружанасць барацьбы, што разгарнулася ў толькі што створаным калгасе, складанасць яе форм. А гэта надае аповесці дынамічнасць, жывасць.

Скупа, але трапна ўмее аўтар перадаць хараство роднай прыроды:

«Змрок у веснавыя вечары гусцее павольна. Спачатку ён кладзецца шэрымі ценямі ля будынкаў і ў садах, потым паступова напаўзае і на больш адкрытыя мясціны, пакуль не дабярэцца да вершалін дрэў і не завалачэ іх сіняй імглой. Так надыходзіць вечар».

Аповесць «Ён быў піянерам»— гэта шчыры, задушэўны расказ пра баявыя справы піянераў трыццатых гадоў, гадоў жорсткай класавай барацьбы на вёсцы, гэта свайго роду гімн перамозе новага светлага жыцця калгаснай вёскі, гімн першым арганізатарам магутнага руху сялянства за калектывізацыю. Аўтар звязаў у адзін сюжэтны вузел баявыя справы піянера Юркі Сасноўскага і яго таварышаў з жыццём маладога калгаса. У толькі што народжаным калектыве разгортваецца барацьба новага са старым. Яна ўскладняецца тым, што тут дзейнічаюць не толькі яўныя ворагі Савецкай улады, але і скрытыя, як дзед Гаўрыла. І няхай учынкамі піянераў кіруе пакуль яшчэ не розум, а сэрца, аднак у аповесці перамогі гэтага дружнага калектыву сімвалізуюць перамогу новага, маладога.

У гэтым — аптымізм кнігі.

Аповесць толькі выйграла б, калі б у ёй зусім не было займальна-прыгодніцкіх сітуацый, надуманых сюжэтных хадоў з мэтай «паказытаць» нервы чытача.

Вось, напрыклад, Юрка і Сяргей высачылі ночу бандыта, які хацеў залезці ў стайню, і спудзілі яго. Захапіўшыся знешнім эфектам пагоні піянераў за бандытам, аўтар вядзе герояў праз увесь лес па вузенькай сцяжынцы амаль па пятах бандыта, узброенага абрэзам. Не верым аўтару і ў сцэне, калі дзед Гаўрыла, нібы запраўскі дыверсант з дэтэктыва, уцякае даволі спрытна з рук праўленцаў.

«— Ах ты! — Юрка з **усяе сілы** ўдарыў Сцёпку каленам(?) у твар.

Сцёпка адхіснуўся і, распасцёршы рукі, паляцеў у снег. Упаў і Юрка. **Падаючы,** ён **ударыў** (!) нагою таго, хто трымаў яго ззаду. Рукі адразу сталі свабоднымі».

Калі ласка, вось вам урок спрактыкаванага майстра-«самбіста». Смакаванне такіх сцэнак вельмі шкодзіць аповесці.

Аддаў аўтар даніну даўно абвергнутаму жыццём механічнаму падзелу герояў па прынцыпу «якія бацькі — такія дзеці». У аповесці гэта гучыць так: Базыль Грыбоўскі вораг, сын яго Сцёпка — таксама; бацькі Валодзі Снегіра і Алёшы Папкоўскага кулакі, дзеці іх таксама нягоднікі; Рыгорка Хамутоўскі нерашучы, баязлівы — копія бацькі. Такі аднабаковы падыход да герояў збядняе, робіць іх даволі ўяўнымі.

І ўсё ж, нягледзячы на адзначаныя недахопы, аповесць Я. Курто «Ён быў піянерам» пакідае неблагое ўражанне і, безумоўна, усхвалюе юнага чытача.

Л. ФАДЗЕЕЎ.

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ

У Дзяржаўным выдавецтве БССР выйшлі з друку і паступілі ў продаж наступныя кнігі:

Балгарскія народныя казкі. Незвычайны асілак. Пераклад В. Адамчыка. Мастак М. Мірчаў. Для малодшага ўзросту. Тыраж 14 тыс. экз., стар. 108. Цана 29 кап.

Украінская народная казка. Як святыя смятану елі. Для дашкольнага ўзросту. Малюнкі Е. Лось і Г. Якубенкі. Тыраж 32 тыс. экз., стар. 20. Цана 16 кап.

Руская народная казка. Церамок. Для дашкольнага ўзросту. Малюнкі М. Карпенкі. Тыраж 40 тыс. экз., стар. 16. Цана 15 кап.

Р. С. Карчэўскі. Мікалай Васільевіч Дучыц. Манаграфія аб старэйшым беларускім мастаку, творчасць якога непарыўна звязана са станаўленнем і развіццём пейзажнага жывапісу ў рэспубліцы. Тыраж 1 тыс. экз., стар. 68. Цана 81 кап.

Сальфеджыо. Частка І. Аднагалоссе. Склалі Б. Калмыкоў і Г. Фрыдкін. На рускай мове. Мастак Л. Прагін. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 108. Цана 49 кап.

Р. Пукст. Рамансы. На словы Я. Купалы, М. Танка, А. Вялюгіна, М. Гамолкі, С. Грахоўскага, А. Дзеружынскага. Тыраж 950 экз., стар. 32. Цана 42 кап.

Зборнік песень. Роднае Палессе. Склаў А. Чопчыц на словы З. Вагера. Музычная апрацоўка беларускіх кампазітараў. Вокладка М. Шырокава. Тыраж 3 тыс. экз., стар. 40. Цана 20 кап.

І. Кузняцоў. У родным краі. Малюнкі для хору а капэла. На словы М. Алтухова, М. Багдановіча, А. Гурло, А. Дзеружынскага, П. Панчанкі. Тыраж 1 тыс. экз., стар. 24. Цана 21 кап.

На кінастудыі «Масфільм» здымаецца новы фільм «Суд вар'яцтву».

У цэнтры карціны, дзеянне якой пачынаецца ў 30-я гады і заканчваецца ў нашы дні, — пёс буйнага нямецкага вучонага-фізіка Іаганеса Вернера. Ён эмігрыруе з фашысцкай Германіі, баючыся, што гітлераўцы выкарыстаюць яго адкрыцці для ваенных мэт. Вернер уцякае ў адну з краін амерыканскага кантынента, дзе становіцца сціплым супрацоўнікам фірмы, якая выпускае тэлевізары.

Мінулі гады. Адгрымела другая сусветная вайна. Рэваншысты імкнуцца развязаць новую сусветную бойню. Яны спрабуюць выкарыстаць ў гэтых мэтах вынаходствы Вернера. Вучоны ўступае ў барацьбу з імі, становіцца актыўным барацьбітом за мір.

Пастаноўку фільма па свайму сцэнарыю ажыццяўляе кінарэжысёр Рыгор Рашаль. Здымае фільм аператар Леанід Касматаў.

На здымку, рабочы момант здымкі. Злева направа — аператар Леанід Касматаў, артыстка Ірына Скобцава, пастаноўшчык фільма Рыгор Рашаль і акцёр Васіль Ліванаў.

Фота А. Канькова. (ТАСС).

ШТО МОЖНА ЗРАБІЦЬ СЁННЯ

У ВЁСЦЫ Палачаны Маладзечанскага раёна пачуў я цікавую размову. Старшыня сельсавета Клара Лявонцьеўна Філіпава і дырэктар сельскага Дома культуры Валянціна Сербава гаварылі аб тым, што ўжо сёння можна зрабіць, каб узняць культурны ўзровень вёскі да ўзроўню горада, і якая ў гэтым роля культасветработнікаў. Валя лічыла, што перш, чым гаварыць пра ўзнясце культуры, трэба стварыць матэрыяльную базу, забяспечыць вёску кадрамі. А без гэтага ні пра які культурны росквіт не можа быць гаворкі.

— На самай справе, хіба гэта Дом культуры? — кіўнула яна ў бок аблупленага, падобнага на пакгауз будынка Палачанскага сельскага клуба. — Столь нізкая, сцэна — двум парам у танцы разысціся няма дзе, ні гардэроба, ні грыміровачнай. А наша ж памяшканне лічыцца адным з лепшых у раёне.

З гэтым пагадзілася і Клара Лявонцьеўна. Але яна глядзела глыбей і далей. Хіба ўся бяда толькі ў памяшканнях? Колькі такіх клубаў, дзе, здаецца, усё ёсць: і сцэна, зробленая па ўсіх правілах тэатральнай тэхнікі, і фае для выставак, і пакоі для гурткоў мастацкай самадзейнасці, а работы не відаць, людзі клуб не наведваюць. Чаму? Ды таму, што там сумна, брудна, няўтульна. Клуб не стаў родным домам калгаснікаў.

— Будаваць, безумоўна, трэба, і будаваць абавязкова будзем, — заключыла Клара Лявонцьеўна.— Але трэба падумаць і аб тым, што можна зрабіць ужо цяпер, не чакаючы, калі будуць належныя ўмовы.

Вось пра гэта і хочацца пагаварыць.

Пачну з таго, што бачыў у тых жа Палачанах.

Мясцовы клуб лічыцца адным з лепшых у раёне. Тут добрая мастацкая самадзейнасць, рэгулярна праводзяцца масавыя мерапрыемствы, ёсць вялікі грамадскі актыў. Ды і памяшканне выглядае куды лепш, чым некалькі год назад, калі тут не было яшчэ ні гэтых фанерных панеляў, густа пафарбаваных блакітнай масленай фарбай, ні крэслаў, ні маляўнічай наглядной агітацыі, ні электрычнага асвятлення. Клара Лявонцьеўна, якая ўсяго год як пакінула культурна-асветную работу, паказваючы то адну, то другую навіну, кожную хвіліну пыталася: «А вось гэта вы бачылі? А вось гэта заўважылі?» Відаць было, што ўсё гэта ёй вельмі падабаецца і яна гатова падзяліцца сваёй радасцю з кожным. Але калі неўзабаве мы выйшлі на вуліцу, Валі Сербавай і Клары Лявонцьеўне давялося перажыць некалькі непрыемных хвілін. Віною быў вялікі, зарослы лопухам двор. Густа зарослая лебядой клумба, рэдзенькія кусцікі бэзу пад вокнамі клуба, — усё гэта рабіла ўражанне безгаспадарчасці і ніяк не стасавалася з нашым уяўленнем аб сельскім асяродку культуры.

— Няўжо ва ўсёй вёсцы толькі і кветак, што жоўтыя вяргіні? — звярнуў я ўвагу Валі Сербавай на клумбу.

— Чаму ж, ёсць і іншыя: флёксы, астры, гладыёлусы, мальвы. Перад кожным домам што-небудзь ды расце.

— А насенне дастаць можаце? Скажам, вясною кожная дзяўчына магла б прынесці вам насення, калі б папрасілі?

— Вядома, прынесла б. Дык мы так і зробім, — хутка адказала Валя, — на той год абавязкова зробім сапраўдны кветнік.

— Чаму ж цяпер запусцілі так?

— Не дагледзелі...

Клара Лявонцьеўна, якая слухала нас і глыбока перажывала, вымушана была прызнацца:

— Наконт кветак — правільна. Тут і мая віна ёсць. Не думаем мы пра чалавека, пра яго радасці, па-казённаму працуем. Сказалі нам пасадзіць дрэвы—пасадзілі, а што вырасце — нікога не цікавіць. Будзе чарговая кампанія — новыя пасадзім... — і, памаўчаўшы, дадала, думаючы, відавочна, пра нешта сваё: — Я вось ішла сёння па вуліцы і бачу — амаль ля кожнага плота то чартапалох, то крапіва. А хіба так цяжка ўсё гэта скасіць, выкарчаваць, насадзіць на іх месца кветкі? Хіба нельга, скажам, да свята пабяліць, як у горадзе, агароджы, пасыпаць жоўтым пяском двары? А гэта ж таксама элемент культуры...

Так, элемент культуры. І кветкі, і дрэвы, і чыста падмеценыя дарожкі, і прыгожа аформленыя клумбы — усё, што стварае ўтульнасць, упрыгожвае быт чалавека.

МНЕ ДАВЯЛОСЯ пабываць у радзе вёсак Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці і, павінен сказаць, што не так ужо многа сустракаецца там садоў, кветнікаў, зялёных насаджэнняў (калі не лічыць, зразумела, лясоў). Малыя Аўцюкі, Гулевічы, Нахаў, Сірад. У гэтых і іншых вёсках тэлеграфных слупоў больш, чым дрэў. Пра ўстановы культуры і гаварыць няма чаго. У некаторых з іх нават сваёй шыльды няма.

Шыльды, кветнікі, афарбоўка сцен, прыгожае размяшчэнне наглядной агітацыі, адпаведнасць формы зместу, выбар праекта і месца будаўніцтва клуба, стыль і танальнасць мэблі, абсталявання, драпіроўкі, — усё гэта пакуль «дробязі», на якія не прынята звяртаць увагі. Той, хто правярае — ці гэта загадчык раённага аддзела культуры, ці інспектар міністэрства — перш за ўсё пацікавіцца, як працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці, колькі прачытана лекцый; радзей — ці ёсць актыў, грамадскія саветы; і амаль ніколі не спытае, чаму на будынках устаноў культуры, на іх фасадным баку замест маляўнічых транспарантаў, пано вісяць такія нязграбныя, тапорнай работы махіны — процівпажарныя шчыты з усімі прыладамі; ці да твару сельскай бібліятэцы аляпаватыя шпалеры з аршыннымі букетамі па шэрым полі. І ці так ужо абавязкова для бібліятэкі ці клуба бачок на пяць вёдзер вады ды яшчэ з коўшыкам на ланцужку? Ці не лепш мець просты графін са шклянкай або некалькі графінаў, калі аднаго мала?.. А між тым, усе гэтыя «дробязі» якраз і ствараюць той казённы, ведамасны выгляд, які не прыцягвае многіх наведвальнікаў у клуб.

У Хожаўскай сельскай бібліятэцы Маладзечанскага раёна панелі памаляваны брудна-карычневай фарбай, што стварае такое ўражанне, нібы ты знаходзішся не ў самой бібліятэцы, а ў калідоры. Таксама пафарбаваны кніжныя стэлажы і — да самай столі — вестыбюль клуба. У зале, дзе і ў сонечны дзень не вельмі светла, на вокнах вісяць цяжкія парцьеры з цёмна-чырвонага плюшу. Адкуль такая прыхільнасць да гэтых непрыветлівых, цёмных тонаў? «А цёмны колер больш практычны», — адказвае дырэктар Дома культуры Мікалай Данілавіч Царык.

І гэта гаворыць чалавек, які ведае, што нават на вытворчасці, дзе, здавалася б, ёсць больш падстаў адстойваць цёмныя фарбы, ад іх адмовіліся.

Пра многія, вельмі многія рэчы задумваешся, калі бываеш у сельскіх установах культуры. Чаму так многа нараканняў на работу клубаў і бібліятэк з боку насельніцтва? Чаму нярэдка нават у выхадныя дні клубы пустуюць? Многія звязваюць гэта з адсутнасцю ва ўстановах культуры цікавых масавых мерапрыемстваў, няўменнем культработнікаў захапіць людзей жывой грамадскай справай. І гэта, безумоўна, правільна, у гэтым адна з асноўных прычын. Але не менш важна і тое, якая ўстанова сама па сабе, які пачуцці абуджае яна ў людзей, ці прыносіць людзям эстэтычнае задавальненне.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

ШТО МОЖНА ЗРАБІЦЬ СЁННЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.).

На жаль, абсталяванне многіх устаноў такое, што, пабываўшы ў іх аднойчы, другі раз зайсці не захочаш. Да гэтага часу не вывеліся грубыя, шматпудовыя лаўкі, гнілаватыя (часам нямытыя!) падлогі, непафарбаваныя вокны, дзверы, неатынкаваныя сцены, са шчылін якіх сыплецца сівы мох, залітыя чарнілам абрусы, вялізныя бар'еры перад сталом бібліятэкара. Якія, напрыклад, дадатковыя капіталаўкладанні патрэбны для таго, каб арганізаваць свабодны доступ да кніжных фондаў у Гулевіцкай прыклубнай бібліятэцы Калінкавіцкага раёна? Ніякіх. Дастаткова зняць паламаны і стары бар'ер. Але бібліятэкар тав. Гарбер адчувае сябе за ім больш спакойна і нічога не робіць.

У іншых установах можна сустрэць і такую «мэблю» — драўляны куб 70×70 см. Прымацаваны гэты куб да сцяны, спераду — дзверцы, на дзверцах — замок. Што гэта за навіна? Аказваецца, тэлевізар схаваны, так сказаць, у футляр ад злоснага вока.

Бясспрэчна, усякую маёмасць, у тым ліку і тэлевізар, трэба берагчы. Але ці нельга гэта зрабіць інакш — пры дапамозе грамадскасці, дзяжурных па клубу? Думаецца, можна, хоць некаторыя культработнікі і не вельмі давяраюць грамадскасці. Кожны раз даводзіцца чуць: «Што вы ўсё напіраеце на грамадскасць? Грамадскасць — прыбірай памяшканне, грамадскасць — дабраўпарадкоўвай, грамадскасць — даводзь кнігу... А па-мойму, калі сам нічога не зробіш, дык ніякая грамадскасць не дапаможа. Дайце больш сродкаў і тады ўсё будзе».

Такія адгаворкі сведчаць толькі аб тым, што чалавек ніколі з грамадскасцю не працаваў або па-сапраўднаму за справу не браўся.

ГАЛОЎНАЕ Ж, што прыносіць вялікую шкоду ўстановам культуры, — гэта безгустоўнасць. Безгустоўнасць робіць установы культуры на адзін капыл, яна здольна загубіць любую арыгінальную думку.

Вось вы ўваходзіце ў фае гарадскога клуба. Вашу ўвагу прыцягвае вялікі стэнд, абцягнуты цёмна-чырвоным з імжою аксамітам. Стэнд асаджаны ў лакіраваны багет. На стэндзе пазалочаныя літары, вялізныя шчыты — свайго роду «п'едэсталы» для карцінак, у сваю чаргу асаджаных у рамкі з каляровай паперы. Пачынаеш прыглядацца, што гэта за карцінкі, удастоеныя такога раскошнага афармлення, — і вачам сваім не верыш: выразкі з часопісаў «Крокодил» і «Вожык» — карыкатуры на п'яніц!

Што гэта — пародыя, жарт? Не, такі стэнд доўгі час упрыгожваў Маладзечанскі гарадскі Дом культуры.

Тое, што патрабуе простага, але дасціпнага сатырычнага плаката, здольнага адгукнуцца на надзённыя пытанні, маладзечанскія работнікі культуры вырашылі ўвекавечыць у аксаміце і пазалоце і не заўважылі таго, што форма не адпавядае зместу.

Гэта ў гарадах. А ў сельскіх установах сустракаешся са з'явамі процілеглага характару — з шэрасцю. Іншыя рэчы проста нельга аднесці да нагляднай агітацыі — настолькі ў іх усё ўмоўнае, прымітыўнае.

Вось адзін характэрны прыклад. У Дудзіцкай прыклубнай бібліятэцы Калінкавіцкага раёна вісіць плакат «Савецкія пісьменнікі аб рэлігіі». На стандартным лісце ватманскай паперы накрэслена некалькі паралелепіпедаў, злёгку заштрыхаваных каляровымі алоўкамі. Гэта — вокладкі кніг, больш дакладна, іх сімвалы, бо ніякага падабенства з кнігамі «паралелепіпеды» не маюць — толькі тое, што прамавугольныя. На іх надпісы «Горкі», «Бедны», «Твардоўскі», «Крапіва», ніжэй — тры цытаты. І ўсё. У якіх творах гэтыя пісьменнікі гавораць аб рэлігіі, што чытаць на гэтую тэму — не сказана ні слова: пра галоўнае забыліся... А недзе ж у справаздачы гэты плакат фігуруе як сведчанне разгорнутай атэістычнай прапаганды!

Што гэта — фармалізм? Так. Але многім культработнікам і такая наглядная агітацыя сходзіць з рук, бо з боку раённых аддзелаў культуры, партыйных органаў на месцах няма належнага кантролю, няма высокіх патрабаванняў.

Нам здаецца, настаў час меркаваць аб нагляднай агітацыі не толькі па тым, **што** зроблена і на якую тэму, але і **як** зроблена. Шэрым, малавыразным фотамантажам, стэндам, розным куткам без адзінага экспаната ў іх, без кніг, без наглядных дапаможнікаў, без жывой канкрэтнай справы трэба сказаць сваё рашучае «не!». У асяродках культуры не павінна быць месца безгустоўнасці, фармалізму, шаблону, якія прасочваюцца часам пад выглядам актуальнасці і надзённасці.

НЕЛЬГА СКАЗАЦЬ, каб вонкаваму выгляду ўстаноў культуры не надавалі сур'ёзнага значэння, каб пра гэта нідзе не гаварылася. Хутчэй наадварот. Калі ўзважыць усе паперы, спісаныя на гэтую тэму, падлічыць усе даклады, кансультацыі і гутаркі, зробленыя з гэтай прычыны на нарадах і семінарах культасветработнікаў хоць бы на працягу года, можна падумаць, што няма больш важнай праблемы ў рабоце ўстаноў культуры, чым гэтая. Тым не менш, воз, як кажуць, і сёння там.

Чаму ж так атрымліваецца?

Справа ў тым, што органы культуры, бібліятэчныя і клубныя метадычныя цэнтры на месцах не цікавяцца кожнай установай паасобку. Разбор недахопаў у афармленні і стварэнні ўтульнасці вядзецца галоўным чынам на раённых нарадах і семінарах, дзе цяжка, а іншы раз і немагчыма зрабіць дэталёвы аналіз кожнага плаката, фотамантажу, кожнай кніжнай выстаўкі, якія ёсць у той ці іншай бібліятэцы, нельга даць канкрэтныя і кваліфікаваныя парады, як іх лепш выправіць, размясціць на стэндзе.

Больш правільна было б, папершае, такія заняткі праводзіць непасрэдна ў саміх клубах і бібліятэках, а, па-другое, на семінарскія заняткі ў раёне прыносіць з сабою ўзоры наглядной агітацыі.

Адной з прычын непрывабнага выгляду многіх устаноў культуры з'яўляецца і тое, што на раённых семінарах культасветработнікаў не практыкуюцца заняткі па дэкаратыўнаму мастацтву, не вучаць культработнікаў афармляць плакаты, пісаць лозунгі, валодаць аплікацыяй, не звяртаюць увагі на спалучэнне колераў, на выбар матэрыялу, шрыфту, формы і г. д. Калі і ставяцца калі-небудзь пытанні аб тым, як аформіць плакат на тую ці іншую тэму, дык гаворка ідзе не пра афармленчае майстэрства, а выключна пра тое, што павінна быць на плакаце, — якія цытаты, ілюстрацыі, вокладкі кніг і г. д. У лепшым выпадку ўкажуць, у якім парадку іх трэба размяшчаць.

У гэтых адносінах ёсць чаму павучыцца ў работнікаў культурна-асветных устаноў Літвы, Латвіі, Эстоніі, дзе для афармлення наглядной агітацыі шырока выкарыстоўваюць такія простыя і агульнадаступныя рэчы, як шкло, аб'ёмныя літары, аплікацыі, гуаш і шэрае палатно, але выкарыстоўваюць з выдумкай, з добрым густам, проста і прывабна. Дарэчы, ва ўстановах культуры гэтых рэспублік вялікае значэнне надаецца таксама рэчам народнага прыкладнога мастацтва — вазачкам, ткацкім вырабам, якія (у меру і да месца) значна ажыўляюць інтэр'ер устаноў культуры, робяць іх не падобнымі ні на якія іншыя, а менавіта на літоўскія, латвійскія, эстонскія.

Няма ў раённых, гарадскіх аддзелах культуры таксама канкрэтных планаў афармлення кожнай культасветустановы, і не было выпадку, каб, прыступаючы да рамонту таго ці іншага клуба, дома культуры, тут загадзя паклапаціліся пра эскіз вонкавага і ўнутранага афармлення гэтых устаноў з улікам мясцовых магчымасцей і ўмоў. А такую работу трэба праводзіць. Толькі пры гэтай умове мы пазбегнем сумнай аднастайнасці і стандарту.

Хто ж павінен узначальваць гэтую работу? У многіх гарадах, прамысловых і культурных цэнтрах краіны — Вільнюсе, Омску, Баку, Краснаярску і іншых цяпер зацверджана пасада галоўнага мастака горада, абавязкам якога з'яўляецца клопат аб паляпшэнні мастацкага аблічча свайго горада. З'ява прыемная! У Вільнюсе, напрыклад, ніводзін магазін не мае права зрабіць рамонт або перааформіць вітрыну без ухвалення праекта галоўным мастаком. Апошні ўзначальвае савет, створаны на грамадскіх асновах.

Такія мастакі вельмі спатрэбіліся б і ў гарадах раённага значэння. На жаль, такой магчымасці пакуль што ў нас няма. Але мастацкі савет стварыць можна! І не толькі пры гарадскім, раённым выканкоме, але і пры раённым доме культуры. Няхай бы гэты савет займаўся пытаннямі знешняй культуры культасветустаноў, даваў ім рэкамендацыі, як упрыгожыць памяшканне, сачыў за станам наглядной агітацыі, валодаў правам «вета» на антымастацкія, бездапаможныя рэчы. Мастацкі савет павінен так паставіць сваю работу, каб без яго ведама і ўхвалення нішто з рэчаў упрыгожання не магло з'явіцца ў раённым доме культуры, у раённай бібліятэцы, на плошчах і вуліцах горада. Што датычыць сельскіх устаноў, дык тут ролю такога грамадскага нагляду павінны выконваць усё тыя ж бібліятэчныя і клубныя саветы.

Бясспрэчна, і цяпер у многіх установах культуры практыкуецца кантроль за нагляднай агітацыяй з боку грамадскасці. Загадчык клуба ці бібліятэкі не павесіць плакат або фотамантаж на надзённую актуальную тэму, не паказаўшы іх сакратару партарганізацыі або членам савета. Але так бывае не ўсюды, не заўсёды і толькі ў адносінах нагляднай агітацыі. Іншыя ж рэчы культработнік робіць на свой, часам не вельмі высокі, густ.

Пастаянны грамадскі кантроль за знешнім абліччам устаноў культуры, за парадкам павінен стаць сістэмай і ахопліваць усю сферу дзейнасці клубаў, бібліятэк, дамоў культуры, паркаў.

Трэба таксама, каб гэтай работай зацікавіліся абласныя і гарадскія дамы народнай творчасці, дзе ёсць кваліфікаваныя кадры мастакоў, графікаў, каб апошнія вучылі культасветработнікаў, забяспечвалі ўстановы неабходнай літаратурай, дапаможнікамі.

Нарэшце, апошняе. Настаў час і нашым спецыяльным навучальным установам, якія рыхтуюць работнікаў клубаў і бібліятэк, пасапраўднаму ўзяцца за эстэтычную адукацыю будучых культасветработнікаў. Тыя нямногія гадзіны, што адводзяцца, напрыклад, у Мінскім педагагічным інстытуце імя Горкага на азнаямленне студэнтаў з гісторыяй мастацтва ў час факультатыўных заняткаў, становішча не мяняюць і мала што даюць студэнтам.

Вось некаторыя думкі, якія хацелася выказаць. Магчыма, узнятыя намі пытанні сяму-таму здадуцца дробязнымі. Але ў культуры няма і не можа быць дробязей.

В. БУРАН,
старшы інспектар Міністэрства культуры БССР.

ЧАСОПІСЫ У КАСТРЫЧНІКУ

«МАЛАДОСЦЬ»

Нумар часопіса адкрываецца артыкулам Б. Паўлёнка «Арыфметыка эпохі», прысвечаным абмеркаванню праекта новай Праграмы і Статута нашай партыі.

Дакументальная аповесць двойчы Героя Савецкага Саюза Сцяпана Шутава «Чырвоныя стрэлы», пачатак якой надрукаваны ў нумары, расказвае пра падзеі першых дзён рэвалюцыі, пра цікавыя сустрэчы аўтара з выдатнымі дзеячамі рэвалюцыйнага руху.

З празаічных твораў надрукавана таксама апавяданне Міхася Міхайлава «Аднойчы», урывак з рамана паўднёва-афрыканскага пісьменніка Гары Блума «Прачка» і працяг дарожных нататак І. Ганзелкі і М. Зікмунда «Па дарогах свету».

Змешчаны вершы Сяргея Грахоўскага, Міколы Маляўкі, Хаіма Мальцінскага, Марка Смагаровіча, Алега Лойкі і Юрася Свіркі.

Нарысы «Чацвёра з Волмы» В. Хліманава, «Куём да шчасця мы ключы» П. Валкадаева, «Агні Белазёрска» С. Кухарава, рэпартажы «Неспакойнае сэрца» А. Дзітлава, «Вечна малады Пінск» М. Цімошака расказваюць пра жыццё, побыт і слаўныя справы нашай моладзі.

Артыкул В. Барысенкі «Пра тых, хто пачынае жыць» прысвечаны маладым літаратарам, іх пошукам у паказе вобраза сучасніка.

Часопіс друкуе рэцэнзіі — Ул. Богана на зборнік вершаў маладой паэтэсы Дануты Бічэль і С. Гусака на кніжку Міхася Даніленкі «Зачараваны гарлачык».

Пра спартыўны шлях маладой беларускай гімнасткі А. Валчэцкай расказваецца ў артыкуле Ніны Пракаповіч «Здзейсненая мара».

Заканчваецца часопіс сатырычнымі вершамі В. Маеўскага «На дудзе манапалістаў...».

«НЕМАН»

Пяты, верасневуюка-кастрычніцкі, нумар часопіса, адкрываецца артыкулам Міхася Лынькова «У імя чалавека, на карысць чалавеку», які прысвечаны найвялікшаму дакументу нашага часу — праекту Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Пад рубрыкай «Аб Леніне, аб партыі, аб камунізме» часопіс друкуе вершы А. Бялевіча, І. Бурсава, В. Паляжаева, Ул. Варно, А. Рабкіна, Н. Кісліка, Э. Агняцвет, апавяданне М. Гамолкі «Ленінскі мосцік» і аповесць Д. Уксусава «Я — твой сябра».

Нарыс П. Валкадаева «Пошукі квадрата» расказвае пра знатнага механізатара рэспублікі А. Худзякова.

Часопіс друкуе заканчэнне дакументальнай аповесці Н. Братушэнкі «У лясах гараць кастры».

Дырэктар Мінскай студыі хранікальна-дакументальных і навукова-папулярных фільмаў М. Горцаў расказвае пра першыя крокі беларускіх кінематаграфістаў.

У раздзеле «Літаратурная крытыка» з артыкулам «Герой і час», прысвечаным праблемам паказу ў літаратуры нашага сучасніка, выступае Ю. Канэ.

У «Кніжным аглядзе» В. Забелін знаёміць чытача з кнігай Т. Панфіловіча «Бітва на рэйках», В. Каваленка піша пра кнігу Н. Перкіна «Шляхі развіцця беларускай савецкай літаратуры» і В. Сазановіч — пра кнігу П. Шасцерыкова «Сонечны прамень».

Творчыя калектывы — да з'езда

Аркестр штаба Беларускай ваеннай акругі карыстаецца вялікай папулярнасцю ў грамадскасці нашай рэспублікі. Гэты творчы калектыў няспынна ўдасканальвае сваё майстэрства і пашырае рэпертуар за лік навінак духавой музыкі і шляхам стварэння пералажэнняў лепшых сімфанічных твораў. Аркестр шырока прапагандуе творчасць савецкіх кампазітараў, у тым ліку і беларускіх аўтараў.

Гэтымі днямі аркестр БВА выступіў перад мінчанамі з новай канцэртнай праграмай, прысвечанай XXII з'езду КПСС. У канцэрце былі выкананы «Святочная уверцюра» Шастаковіча, «Юбілейны марш» Іпалітава-Іванова, «Італьянскае капрычыо» Чайкоўскага і інш. Творчасць беларускіх кампазітараў была прадстаўлена «Маршам» Я. Цікоцкага, фіналам фартэпіяннага канцэрта Д. Камінскага, урыўкамі з оперы «Калючая ружа» Ю. Семянякі і іншымі творамі.

У якасці салістаў у канцэрце выступалі: спевакі оперы Э. Шаўкавец і В. Ганчарэнка, піяністка філармоніі Е. Эфрон і ваенныя музыканты Э. Шайбакоў, В. Арлоў, В. Сакалоў, О. Сцяпанаў.

Увесь канцэрт на высокім прафесіянальным узроўні правялі ваенныя дырыжоры В. Мартынаў, А. Майзлер і І. Зарэцкі.

На нашых здымках вы бачыце (унізе) выступленне аркестра БВА, уверсе — ансамбля песні і танца БВА, які таксама падрыхтаваў да партыйнага з'езда вялікую святочную праграму.

Фота **М. Рубінштэйна** і **Ул. Крука.**

Летапіс калгаса „Сталінец"

Краязнаўцы сяла Моўчадзь Гарадзішчанскага раёна ствараюць летапіс калгаса «Сталінец». Гэтая калектыўная праца ярка адлюстроўвае мінулае навакольных вёсак, тыя велізарныя змены, якія адбыліся тут за гады Савецкай улады.

Да 1939 года на тэрыторыі цяперашняга калгаса была толькі адна пачатковая школа. Цяпер працуюць сярэдняя школа з выварчым навучаннем, вячэрняя сярэдняя школа сельскай моладзі, васьмігадовая, сямігадовая і дзве пачатковыя школы.

Вялікую цікавасць маюць матэрыялы і дакументы, якія характарызуюць стан аховы здароўя. Калі ў гады ўладарання панскай Польшчы насельніцтва сёл абслугоўваў адзін фельчар, то цяпер тут ёсць: амбулаторыя, бальніца, фельчарска-акушэрскі пункт, аптэка. Вялікія клопаты аб здароўі хлебаробаў праяўляе арцель. Па рашэнню агульнага сходу створан лячэбны фонд, у які адлічваецца 1 працэнт даходаў грамадскай гаспадаркі. Узводзіцца калгасны дом адпачынку на 150 чалавек.

Калгасны летапіс расказвае аб расшырэнні сельскіх прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання, арганізацыі хлебапякарні, сталовых, росце дабрабыту хлебаробаў.

Пяцьдзесят работ самадзейнага скульптара

За паваленым бурай дрэвам прытаіліся са зброяй у руках трое партызан. Народныя мсціўцы сочаць уважліва за лясной дарогай. Гэтую сюжэтную скульптуру «У засадзе» вылепіў з гліны адной левай рукой супрацоўнік Смаргонскага райпрамкамбіната А. І. Жываеў (правую руку ён страціў у 1936 годзе ў выніку няшчаснага выпадку).

Гэта не першая работа Аляксандра Іванавіча. За апошнія дзесяць год ён стварыў каля 50 розных твораў. З вялікім майстэрствам вылепіў самадзейны скульптар з гліны і адліў затым у гіпсе скульптуру «Ленін на трыбуне», якая ўстаноўлена ў цэнтры рабочага пасёлка торфапрадпрыемства «Бярэзінскае», узнавіў у гіпсе партрэты Карла Маркса, Максіма Горкага, Льва Талстога і Янкі Купалы.

Добрую ацэнку прафесіянальных мастакоў атрымалі таксама і такія творы народнага ўмельца як «Цялятніца», «Фізкультурнік», «Піянерка», «Дзяўчына з кнігай», «Юны мічурынец» і іншыя.

Вялікія планы ў А. І. Жываева на будучыню. Ён вырашыў стварыць скульптуры Патрыса Лумумбы, Фідэля Кастра і брыгадзіра трактарнай брыгады камуністычнай працы калгаса «Чырвоны партызан» Смаргонскага раёна Пятра Ліса. Аляксандр Жываеў думае стварыць таксама карціну «Пануль білася сэрца» — аб пагранічніках легендарнай заставы, якой камандаваў у пачатку Вялікай Айчыннай вайны лейтэнант В. Усаў.

ПАКАЗВАЮЦЬ АМАТАРЫ СЦЭНЫ

Драматычныя калектывы Магілёўшчыны сустракаюць XXII з'езд КПСС творчымі падарункамі. Гэта новыя спектаклі па Вялікі Кастрычнік, геніяльнага правадыра рэвалюцыі Ул. І. Леніна, герояў нашых дзён, актыўных будаўнікоў камунізма, пра барацьбу з перажыткамі мінулага ў свядомасці людзей.

Бабруйскі народны тэатр падрыхтаваў спектакль па п'есе М. Пагодзіна «Крамлёўскія куранты», Народны тэатр клуба мясцовай прамысловасці Бабруйска — камедыю І. Горава «Пяшчотны бацька».

Рэпертуар Народнага тэатра Магілёўскага клуба чыгуначнікаў папоўніўся двума спектаклямі: «Дзеля сваіх блізкіх» па п'есе В. Лаўрэнкава і «200 тысяч на дробныя выдаткі» па камедыі Ул. Дыхавічнага і М. Слабадскога.

Рабочыя Магілёўскага завода штучнага валакна глядзяць у выкананні драмкалектыву заводскага Дома культуры спектакль «Кветкі жывыя» па п'есе М. Пагодзіна. Драмкалектыў клуба Магілёўскай швейнай фабрыкі ажыццявіў пастаноўку п'есы М. Старажовай «Бяссонніца».

Глускія аматары сцэнічнага мастацтва падрыхтавалі спектакль па п'есе Я. Ялунера «Цыганскі характар».

У Бялынічах на сцэне раённага Дома культуры пастаўлена «Кухарка» А. Сафронава, у Краснаполлі — «Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка, у Мсціславе — «Не верце цішыні» І. Шамякіна.

ШЛЯХІ ТВОРЧАСЦІ

Сучасная польская паэзія

Пятро ГЛЕБКА

Беларуская літаратура заўсёды наймацней была звязана з літаратурамі суседніх славянскіх народаў — рускай, украінскай і польскай. У цесным узаемадзеянні з імі, а ў пэўныя перыяды часам пад непасрэдным уплывам мацнейшых з іх, яна знаходзілася на працягу ўсяго свайго гістарычнага развіцця. Тлумачыцца гэта не толькі тым, што літаратуры нашых славянскіх суседзяў блізкія і даступныя нам па мове, але ў першую чаргу і той акалічнасцю, што гістарычны лёс нашых народаў заўсёды цесна пераплятаўся. Іменна таму цікавасць не толькі беларускіх пісьменнікаў, але і радавых чытачоў да польскай літаратуры была заўсёды, бадай, такой жа жывой, як і да рускай і ўкраінскай. Нават у ліхія часы панавання ў Польшчы антысавецкіх буржуазных урадаў, якія імкнуліся як мага адгарадзіць польскі народ ад народаў Савецкага Саюза, мы з цікавасцю сачылі за развіццём польскай літаратуры. У нас перакладаліся ў тыя гады творы Уладзіслава Бранеўскага, Станіслава Рышарда Стандэ, Бруна Ясенскага, Ванды Васілеўскай, Ляона Кручкоўскага і іншых рэвалюцыйных і прагрэсіўных пісьменнікаў Польшчы.

Асабліва глыбока цікавіцца наша грамадскасць сучаснай літаратурай польскага народа, які ў дружнай сям'і краін сацыялістычнага лагера будуе новае жыццё. Цікавасць гэтая сёння яшчэ больш зразумелая: нашы народы паставілі перад сабою адну мэту, яны жывуць аднымі ідэаламі, і мастацкая літаратура, як выразнік настрояў і дум народа, павінна быць асабліва яркім паказчыкам усяго, што адбываецца ў працэсе барацьбы за ажыццяўленне пастаўленых мэт. Іменна таму мы з такой гарачай цікавасцю сочым за сучаснай польскай літаратурай і звяртаемся да яе, бо спадзяёмся знайсці ў ёй жывое, поўнае і яркае адлюстраванне жыцця польскага народа — нашага брата і саратніка ў барацьбе за перадавое чалавечае грамадства.

Ці задавальняе ў гэтым сэнсе нашу цікавасць сучасная польская паэзія? Я думаю, што наша супольная накіраванасць да вялікіх мэт, наша брацкая дружба з польскімі літаратарамі дае права сказаць пра гэта шчыра і адкрыта, не крывячы душой, што мне і хочацца зрабіць у гэтых кароткіх нататках.

Паэты — вельмі шматлікі і таленавіты атрад літаратурнай Польшчы. Сучасны польскі паэт Ян Капроўскі адзначае ў адным са сваіх артыкулаў, што «паэзія вякамі займае галоўнае месца ў польскай літаратуры. Гісторыя прызначыла ёй немалую ролю, і хоць гістарычная сітуацыя змянілася — польская паэзія знаходзіцца ў цэнтры ўвагі. Справядлівасць патрабуе прызнаць, што вобраз сучаснай польскай паэзіі вельмі разнастайны і што належыць яна да адной з цікавейшых паэзій Еўропы».

З гэтым нельга не пагадзіцца.

Сучасную польскую паэзію прадстаўляюць звыш 150 паэтаў розных школ і розных літаратурных пакаленняў. Сярод іх ёсць паэты, якія працавалі ў паэзіі яшчэ ва ўмовах буржуазнай Польшчы, і паэты, якія прыйшлі ў літаратуру ў пасляваенныя гады і зусім нядаўна. Сярод першых трэба назваць такія шырока вядомыя імёны, як Леапальд Стаф, Юліян Тувім, Уладзіслаў Бранеўскі, Канстанты Ідэльфанс Галчынскі, Ярослаў Івашкевіч, Антоні Сланімскі, Мячыслаў Яструн, Юліян Пшыбась і многія іншыя. Розныя па творчых напрамках, яны яшчэ больш рознымі былі па ідэйнай накіраванасці. Патрыярх новай польскай паэзіі Леапальд Стаф (1878—1957), выступіўшы на літаратурную арэну на пераломе XIX і XX стагоддзяў, у даваеннай сваёй творчасці быў некалькі ў баку ад вялікіх сацыяльных падзей свайго часу, але вера ў чалавека як творцу культуры і прагрэсу заўсёды жывіла яго творчасць глыбокім жыццёвым аптымізмам. Гэта можна сказаць і пра паэзію Яраслава Івашкевіча і некаторых іншых паэтаў старэйшага пакалення.

Цясней быў звязаны з народам, з яго надзеямі і спадзяваннямі такі выдатны паэт польскага народа, як Юліян Тувім (1894—1954). Тонкі лірык, які не цураўся часта лагоднай усмешкі і дасціпнага сатырычнага слова, ён чула ставіўся да радасцей і пакут простага чалавека і востра высмейваў усё пошлае і мяшчанскае. Падобны ж ідэйна-мастацкі кірунак мела і паэзія больш маладога здольнага паэта Канстанта Ідэльфанса Галчынскага (1905—1953).

З рэвалюцыйных пазіцый у абарону працоўнага чалавека выступаў яшчэ ва ўмовах буржуазнапамешчыцкай Польшчы таленавіты паэт польскага рабочага класа Уладзіслаў Бранеўскі. Наватар верша, спалучыўшы ў творчасці прагрэсіўныя традыцыі польскай класікі і рэвалюцыйныя традыцыі Ул. Маякоўскага, сваім новым мастацкім словам ён сумленна служыў вялікай справе сацыяльнага вызвалення працоўных Польшчы. Пра гэтага выдатнага песняра Ю. Тувім гаварыў, што «ён авалодаў незвычайным сакрэтам насычэння жыцця і змагання паэзіяй, а паэзіі — жыццём і барацьбой, як ніхто з яго сучаснікаў, як толькі нямногія з паэтаў папярэдніх пакаленняў».

Рэвалюцыйнае мастацкае слова Ул. Бранеўскага заклікала да творчасці і згуртавала вакол яго напрамку нешматлікую, але здольную групу паэтаў (Станіслаў Выгодскі, Люцыян Шэнвальд, Леан Пастэрнак, Ежы Путрамант, Станіслаў Рышард Дабравольскі і інш.).

Аднак трэба сказаць, што ў даваеннай Польшчы прагрэсіўныя паэты складалі не вельмі шматлікую групу і не яны вызначалі асноўны каларыт тагачаснай паэзіі. Хутчэй гэта быў толькі вельмі яркі, але адзінокі прамень на даволі цёмным фоне паэзіі вузкіх інтымных перажыванняў, паэзіі, адарванай ад народа і яго нацыянальных традыцый і вельмі падкай на самыя разнастайныя мадэрнісцкія напрамкі ўпадніцкай літаратуры Захаду.

Польскі літаратар Юры Барэйша на старонках часопіса «Адрадзэнне» гаварыў у сувязі з гэтым, што польская даваенная літаратура была «затхлым, правінцыяльным, эгацэнтрычным захалусцем снобаў, якія, як малпы, капіравалі заграніцу», у ёй панавалі «донкіхоцтва, псеўдарамантызм, фальсіфікацыя ідэй і прапахлы нафталінам снабізм» [1]).

Падобную ацэнку даваеннай польскай літаратуры ў тым жа часопісе «Адрадзэнне» даваў і вядомы паэт Мячыслаў Яструн, калі пісаў, што польскіх пісьменнікаў «вайна застала непадрыхтаванымі да таго, каб словам сваім падняць яе цяжар», што «іх зброя аказалася кволай, вытанчанай, дробнакалібернай», што «ўся нікчэмнасць мастацтва спадкаберцаў сімвалізму стала яўнай, паказаўшы ўсю спустошанасць гэтага напрамку, улюбёнага ў сябе». [2])

Пагаджаючыся з гэтай ацэнкай даваеннай польскай літаратуры, у тым ліку і паэзіі, мы павінны з прыемнасцю падкрэсліць, што хаця яна і не была падрыхтавана да суровых ваенных выпрабаванняў, аднак у працэсе вайны разгарнула свае сілы, загартавала іх у барацьбе з гітлерызмам і з гонарам выконвала пачэсную ролю мастацкай зброі народа. Іменна ў гады вайны ў актыўную барацьбу за вызваленне народаў з фашысцкай няволі ўключыліся многія таленавітыя польскія паэты, якія ад надзённых спраў народа стаялі раней некалькі ўбаку. Цяпер разам з народам, разам з усім прагрэсіўным лагерам польскай літаратуры яны змагаліся супраць фашызму ў Савецкай Арміі і ў Войску Польскім, у партызанскіх атрадах і ў падполлі, у эміграцыі і ў канцэнтрацыйных лагерах.

У агні баёў за вызваленне Польшчы нарадзілася новая польская паэзія, якая згуртавала ў сваіх шэрагах, вакол прагрэсіўнага крыла прадстаўнікоў даваеннай літаратуры, шырокія колы маладых і старэйшых паэтаў. Гэтая паэзія ўслаўляла барацьбу народаў супраць фашызму і была прасякнута глыбокай верай у перамогу. Важна адзначыць, што гэтыя надзеі бадай заўсёды звязваліся з савецкім народам, з яго гераічным змаганнем. І нямала цёплых вершаў польскія паэты прысвяцілі ў тыя гады Савецкай Арміі, дружбе народаў. Тут можна назваць вершы Е. Путраманта, Л. Шэнвальда, М. Яструна, Л. Пастэрнака, А. Важыка, С. Р. Дабравольскага, Г. Яворскай і іншых. Польскія паэты правільна паказвалі ў сваіх творах, што шлях да незалежнай Польшчы пачынаецца пад Сталінградам і вядзе да Варшавы праз перамогі Савецкай Арміі. Гэту думку добра выказаў у вершы «Гісторыя» А. Важык:

Тыя, хто ваяваў за Адэсу,
Тыя, хто бараніў Севастопаль, —
Нас бараніў і сябе.
Там, дзе Волга зближаецца з Донам,
Там, дзе попел і друз Сталінграда, —
Там уратован наш дом.

Змагаючыся за вызваленне Польшчы з ярма фашысцкай няволі, перадавыя польскія паэты разумелі, што справа павінна ісці не толькі аб нацыянальным, але і сацыяльным вызваленні польскага народа, што прагніўшы капіталістычны лад не павінен больш вярнуцца, а на месцы яго маюць быць створаны новае сацыяльнае грамадства і новая польская дзяржава. Іменна пра гэта, як піша ў адным з вершаў Л. Пастэрнак, думае польскі салдат, разважаючы на прывале, ці прыпадзе яму «кавалак чорнага поля». Іменна пра гэта марыць і сам паэт, калі ў другім вершы сцвярджае, што здань Вронак і Бярозы Картузскай не павінна больш засланяць светлы вобраз роднай краіны.

Пад кіраўніцтвам Аб'яднанай рабочай партыі польскі народ пасля вызвалення ад фашысцкай акупацыі ўзяў справу ўстанаўлення новага ладу жыцця ў свае рукі. Закіпела работа па адналенню разбуранай вайной гаспадаркі і культуры краіны. Польскія паэты з радасным хваляваннем пішуць пра стваральную работу свайго народа. З'яўляюцца вершы пра адбудову Варшавы Ул. Бранеўскага, паэма «Сёння» Анджэя Мандальяна, вершы такіх маладых паэтаў, як Анна Каменская, Крыштаф Грушчынскі, Тадэвуш Кубях і інш. Тэма адбудовы Варшавы гучыць як сімвал адбудовы ўсёй краіны на новых, сацыялістычных асновах.

З хвалюючымі вершамі пра мір выступаюць Л. Стаф, Ю. Тувім, Я. Івашкевіч, К. І. Галчынскі. Вершы, насычаныя надзённымі турботамі народа, пішуць Е. Путрамант, Л. Пастэрнак, М. Яструн, С. Р. Дабравольскі, Ю. Пшыбась, С. Поляк, Л. Левін. Да іх далучаюць свае свежыя галасы А. Мендзыжэцкі, Т. Ружэвіч, А. Слуцкі, В. Шымборская і другія маладыя паэты. Пакуты, перажытыя ў час акупацыі, мужнасць народа ў барацьбе за вызваленне, яго самаадданая праца на будоўлях сацыялізма, барацьба за мір і шчасце чалавецтва складаюць тэматычную аснову польскай паэзіі, у прыватнасці вельмі і вельмі многіх тых твораў, якія былі напісаны ў першыя дзесяць гадоў пасля вайны. Вядомая марксісцкая формула сацыялістычнага мастацтва як мастацтва сацыялістычнага па зместу і нацыянальнага па форме знайшла сваё пацвярджэнне ў пасляваеннай творчасці лепшых польскіх паэтаў. Будучы па форме яркім выражэннем самабытных нацыянальных традыцый, па зместу яна многімі матывамі пераклікаецца з

(Заканчэнне на 4-й стар.).

[1]) Гл. Марк Жываў. «Современная польская литература». Масква, 1947.

[2]) Там жа.

Падзеі Факты Навіны

□ «Беларускія кампазітары XXII з'езду КПСС» — гэтай тэме былі прысвечаны чарговыя заняткі універсітэта культуры Мінскага акруговага Дома афіцэраў. На заняткі універсітэта прыйшлі кампазітары Я. Цікоцкі, М. Аладаў, М. Шнейдэрман, Г. Вагнер, Д. Камінскі, С. Аксакаў, Э. Тырманд.

Я. Цікоцкі расказаў аб новых творах беларускіх кампазітараў. У канцэртную частку заняткаў былі ўключаны многія з гэтых твораў. Іх выканалі артысты В. Фурс, А. Астрамецкі, В. Ганчарэнка, Л. Гарэлік, М. Марозава, Б. Нікольскі, Д. Зубрыч, Т. Міянсарава.

□ «Раўненне на маякі» — так называецца новая праграма, падрыхтаваная да XXII з'езда КПСС калектывам мастацкай самадзейнасці клуба чацвёртай брыгады калгаса «Камінтэрн» Магілёўскага раёна. У песнях і вершах мясцовых паэтаў праслаўляюцца маякі калгаса: даярка, Герой Сацыялістычнай Працы Т. Зубарава, знатная кукурузаводка В. Кузьмянкова, майстар вырошчвання высокіх ураджаяў Ільну К. Шавялькова, перадавыя механізатары.

Брыгадны калектыў мастацкай самадзейнасці ўжо выступіў у Купялах, Палавінным Лозе, Першай і Другой Мікалаеўках і іншых вёсках калгаса «Камінтэрн», а таксама ў суседняй сельгасарцелі імя Валадарскага.

□ Звыш 30 год удзельнічае ў мастацкай самадзейнасці баяніст Аляксандр Аляксеевіч Курбатаў. Калектыў Гомельскага Палаца культуры чыгуначнікаў імя Ул. І. Леніна днямі адзначыў 60-годдзе з дня яго нараджэння. БРК прафсаюза чыгуначнікаў прыслаў А. Курбатаву прывітальную тэлеграму. Юбіляру быў уручаны каштоўны падарунак.

Цяпер Аляксандр Аляксеевіч Курбатаў з'яўляецца грамадскім кіраўніком дзіцячага ансамбля баяністаў.

□ Народныя кніжныя кіёскі, якія нядаўна адкрыліся на некаторых прадпрыемствах і ва ўстановах горада Пінска, адразу зарэкамендавалі сябе як дзейсная форма пазамагазіннага гандлю.

Такія кіёскі добра працуюць пры музычнай школе, леспрамгасе, райвыканкоме і інш. Ім у рабоце аказваюць дапамогу кніжныя магазіны аблкнігагандлю № 8 і № 9.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА
13 кастрычніка

ШЛЯХІ ТВОРЧАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

нашай беларускай ды і наогул з усёй савецкай паэзіяй таго часу. У гэтым у пэўнай ступені выявілася адзінства імкненняў і мэт нашых народаў. І, я думаю, можна не памыляючыся сказаць, што лепшыя творы польскай паэзіі тых гадоў у ідэйна-мастацкіх адносінах — прадукт аднаго і таго ж метаду сацыялістычнага рэалізму.

Сіла іх у тым, што яны — вынік рашучага павароту польскіх паэтаў да праблем сацыялістычнай перабудовы краіны, што ў іх правільна адлюстраваны гістарычныя перспектывы развіцця Польшчы. Відаць, што паэты цесна былі звязаны з жыццём свайго народа і жылі яго думамі і перажываннямі.

На жаль, калі чытаеш польскую паэзію апошняга пяцігоддзя, ствараецца ўражанне, што многія паэты нібы страцілі гэтую жыватворную сувязь. Я прама скажу: у сапраўдных і шчырых прыхільнікаў польскай паэзіі выклікае горкі смутак і жаль той факт, што частка польскіх паэтаў раптам нібы спужалася таго шляху, на які яна стала, і адхіснулася ад яго. Больш таго, некаторыя польскія літаратары, у тым ліку і такія таленавітыя паэты, як Ю. Пшыбась, А. Сланімскі, павялі прамую атаку на метад сацыялістычнага рэалізму. Да чаго гэта прывяло, можна меркаваць хоць бы паводле такога твора А. Важыка, як «Паэма для дарослых», дзе страчана ўсякая гістарычная перспектыва, дзе жыццё сучаснай Польшчы, яе слаўная моладзь, якая так самааддана будуе сваю светлую сацыялістычную будучыню, паказаны ў самым чорным святле. Ведаючы ранейшую творчасць А. Важыка, асабліва яго ваенныя вершы і творы першых год пасля вайны, цяжка нават паверыць, каб асобныя адмоўныя з'явы рэчаіснасці маглі так засланіць перад паэтам усё шырокае і светлае жыццё, што паэт бадай цалкам выракаецца сваіх ранейшых прынцыпаў.

Трэба сказаць, што гэтая «чорная літаратура», «літаратура разліку», як яе называюць у Польшчы, не мае нічога агульнага з творчасцю перадавых польскіх пісьменнікаў. «Ідэі разліку» бадай не закранулі не толькі рэвалюцыйнага крыла, але і наогул асноўнай часткі прагрэсіўных паэтаў даваеннага пакалення.

Аднак матывы расчаравання, абыякавасці, адыходу ад вялікіх надзённых спраў народа, ад паэтычнай «прастаты» ўсё ж такі знайшлі адбітак і ў творчасці некаторых старэйшых паэтаў.

Тут можна назваць хоць бы апошні зборнік М. Яструна «Большае за жыццё», дзе, як правільна сцвярджае польская крытыка, намеціўся адыход ад творчага напрамку паэта 1944—1955 гг. і паварот да стылю, які ў даваенныя час звязваў М. Яструна з сімвалізмам і які характарызуецца своеасаблівай зашыфроўкай твораў, «поўнасцю даступных толькі тым, хто ведае акалічнасці іх з'яўлення».

«Ідэі разліку» зрабілі значны адмоўны ўплыў на паэтычную моладзь. Іменна гэтым тлумачацца бясплённыя фармалістычныя пошукі многіх маладых польскіх паэтаў. «Наватарства» іх—не ад пошукаў новага жыццёвага зместу, а ўсё ад таго ж даваеннага захаплення «модамі» Захаду.

У якасці прыкладу такой «паэзіі» можна прывесці верш Анджэя Кусневіча з яго нізкі «Сезон у раі».

Ястрагубыя — выступі!
Рудаптушыя — выступі!
Гарбатыя — на руках
—Стой!
Найперш — Патры
Яркі
—раз — на зуб
(а яшчэ па дрэвах селядцом
зялёна)
А цяпер — Герку
Лесы
—на газ
(селядзец там месяцам спявае
— але ўжо
вывя
трэла
стрэлам)
Варам з вядра — хлюп!
На мурашкі Геркулянум.

Вось і ўвесь змест верша і яго форма, перададзеныя ў перакладзе вельмі дакладна. Змест, як можна здагадвацца, накіраваны супраць паэзіі старых «геркулесаў», якіх Кусневіч называе «мурашкамі геркулянум». Крыўдна не тое, што такія вершы пішуцца і друкуюцца. Крыўдна, што пад іх падводзіцца нават тэарэтычная база. Паэт і крытык Збігнеў Бянькоўскі ў артыкуле «Некалькі слоў пра сэнс» піша:

«Прызнанне якога-небудзь верша (сучаснага) за бяссэнсны не можа быць закідам, бо твор сучаснай паэзіі сапраўды бяссэнсны, г. зн. не мае таго сэнсу, які спадзяецца знайсці ў ім хто-небудзь, незнаёмы з механізмам асацыяцый і новай якасцю слова. Не сэнс з'яўляецца ягонай меркай, а шок, зарад эмоцый, здзіўленне і жах, якія ён змяшчае». І далей: «Сучасная паэзія не выконвае ніякай службовай ролі ні ў адносінах гісторыі, ні ў адносінах сэнсу. Сама яна з'яўляецца ўласным сэнсам. Словы не азначаюць, г. зн. не маюць сталага, раз назаўсёды ім дадзенага зместу, але атакуюць, урываюцца ў выабражэнне свету, разрываюць яго. Ствараюць прывіды чыстыя, абсалютныя. Асляпляюць. У гэтым сэнс сучаснай паэзіі, сэнс яе існавання».

Некаторыя «тэарэтыкі» такой «паэзіі» ідуць яшчэ далей і гатовы зусім выгнаць з паэзіі слова. Так, Ян Непамуцан Мілер у артыкуле «Паэзія знакаў» (з падзагалоўкам «Пунктуацыя як мастацтва»), змешчаным сёлета ў трэцім нумары часопіса «Твурчасць», піша: «Паэт стараецца часта сказаць больш, чым гэта можа зрабіць слова, выкарыстоўваючы для гэтага надзвычайную гука-музычную гармонію, раскладаючы часамі слова на яго першапачатковыя элементы. Так і знакі прыпынку могуць стаць у прынцыпе самастойным сродкам выражэння мастацкага зместу, не толькі ўдакладняючы, але і надаючы яго незалежна». «Праўда,—агаварваецца далей Мілер,—знакаў гэтых, асабліва з пачуццёвым значэннем, так мала, што нагадваюць яны адну струну музычнага інструмента, але віртуоз, бадай, і на адной струне сыграе Бетховена... Сумненні гэтыя зрэшты тычацца толькі традыцыйных знакаў. Перад кожнай творчасцю дзверы адчынены». І Мілер прапануе ствараць новыя знакі і іх камбінацыі, якія «маглі б развіцца ў досыць стройную графічна-пунктуацыйную сімволіку пачуццёвых станаў накшталт музычных нот».

У заключэнне свайго артыкула Мілер піша: «Сцвярджаючы мажлівасць існавання паэзіі знакаў, мы не выстаўляем ніякага лозунга, ніякай праграмы. Было б смешна сцвярджаць, што трэба пісаць толькі пытальнікамі, кропкамі або коскамі... Справа для мяне хутчэй ідзе пра ўскоснае сцвярджэнне, што ўсё з'яўляецца альбо можа быць мастацтвам, што граніцы яго сродкаў неабмежаваныя, што мы не ведаем і не можам вырашаць, да якіх сродкаў захоча звярнуцца мастацтва будучага...»

Я даволі падрабязна спыніўся на выказваннях Яна Мілера не толькі таму, што яго артыкул надрукаваны ў такім паважным часопісе, як «Твурчасць», а ў першую чаргу таму, што ён вельмі характэрны для эстэтычных поглядаў даволі значнай часткі сучасных польскіх паэтаў і крытыкаў. Чытаючы іх выказванні і творы, няцяжка заўважыць, што як у тэорыі, так і на практыцы яны бадай усю ўвагу аддаюць форме і амаль нічога не гавораць пра змест. Іх пошукі новых шляхоў для паэзіі маюць фармалістычны характар. І ў гэтым сэнсе нам здаецца, што нашы польскія таварышы стаяць тут на няправільным шляху. Сапраўднае наватарства пачынаецца заўсёды з пошукаў новага зместу, які немінуча прыводзіць і да новай формы. Сучасная польская рэчаіснасць надзвычай багатая гэтым зместам, і задача паэтаў — у тым, каб адчуць яго і зразумець, авалодаць ім і раскрыць. Толькі ў выніку гэтага з'явяцца сапраўды наватарскія творы, якія ўзбагацяць сабой не толькі польскую, але і ўсю сусветную літаратуру. Хацелася б, каб маладыя паэты Польшчы, асабліва такія здольныя, як Тадэвуш Ружэвіч, Ежы Гарасімовіч, Граховяк і іншыя, чые таленты самі просяцца да сэрца народа, хутчэй зразумелі гэту вялікую задачу сваёй нацыянальнай паэзіі і знайшлі правільны шлях да яе вырашэння.

Паэтычная дыскусія, якая ўжо некалькі месяцаў вядзецца ў Польшчы, дае падставы меркаваць, што ўсё больш і больш паэтаў бачаць гэты шлях у цеснай сувязі з жыццём народа, у шырокім паказе яго стваральнай працы па будаўніцтву сацыялізма, у пошуках новай, але зразумелай і даступнай мастацкай формы. І мы ўпэўнены, што таленавітыя польскія паэты, усё цясней і цясней звязваючы творчыя пошукі з працай народа, усё глыбей і глыбей пранікаючы ў яго жыццё, пераадолеюць свае недахопы і парадуюць чытачоў новымі бліскучымі творамі. І ў гэтым напрамку мы ад шчырага сэрца жадаем нашым польскім сябрам самых вялікіх поспехаў.

ЛЯ СІНЯЙ БУХТЫ

Імя Максіма Багдановіча добра вядома ў сонечным Крыме. Цяпер грамадскасць вобласці рыхтуецца адзначыць 70-годдзе з дня нараджэння песняра слуцкіх ткачых.

Цяжкая, невылечная па тым часе хвароба прымусіла Максіма Адамавіча тройчы быць у далёкім ад Беларусі Крыме. Крымскія вершы і артыкулы займаюць віднае месца ў творчасці Максіма Багдановіча. Мала падабенства ў прыродзе Беларусі і Крыма, але паэту хацелася знайсці якія-небудзь агульныя рысы, і калі яму сустракаліся тут сосны або ёлкі, ён кланяўся ім, як сваім дарагім землякам.

Ялцінскія краязнаўцы ўстанавілі кватэры, у якіх жыў паэт. Цалкам захавалася апошняя кватэра, больш дакладна — пакой у доме па вуліцы Камунараў ля самай бухты, дзе Максім Багдановіч пасяліўся пасля прыезду з Мінска ў 1917 годзе і дзе пражыў некалькі месяцаў ужо зусім хворы і памёр у маі таго ж 1917 года.

Багдановіч хацеў быць бліжэй да мора, якое падабалася яму сваёй сінявой, сваімі бяскрайнімі прасторамі. І гэты пакой у старым белым доме, на другім паверсе, якраз і даваў магчымасць аўтару «Вянка» любавацца сінім морам.

Яшчэ і цяпер жывуць у Ялце старыя, якія ў свой час сустракаліся з нашым песняром. Жыве медыцынская сястра, якая лячыла яго. Вельмі шкада, што да гэтага часу не запісаны падрабязныя ўспаміны людзей, якія ведалі Максіма Багдановіча. А гэтыя ўспаміны маглі б многае даць для асвятлення крымскага перыяду ў жыцці і творчасці паэта.

Навуковыя супрацоўнікі Ялцінскага краязнаўчага музея ўжо шмат год вывучаюць крымскія старонкі біяграфіі паэта. Выяўлена нямала цікавых і каштоўных фактаў, але пакуль у біяграфію М. Багдановіча гэтыя факты яшчэ не ўвайшлі, таму што па сутнасці падрабязнага апісання жыцця класіка нашай літаратуры яшчэ няма. Частка гэтых матэрыялаў экспануецца ў музеі па вуліцы Паўленкі, 3. Літаратурны музей расказвае нам пра кожнае з трох знаходжанняў М. Багдановіча ў Крыме, прыводзяцца вытрымкі з твораў паэта аб Крыме, цытуюцца яго думкі з публіцыстычных артыкулаў, у свой час напісаных тут. Ёсць і розныя ілюстрацыі. Да 70-годдзя з дня нараджэння М. Багдановіча яго куток у літаратурным музеі будзе папоўнены і пашыраны. З Мінска сюды прыслалі новыя выданні кніг паэта, матэрыялы аб ім.

Настаў час выпусціць фільм аб жыцці, творчасці, навуковай дзейнасці гэтага цудоўнага паэта. Студыя «Беларусьфільм» магла б прыцягнуць Ялцінскую кінастудыю і сумеснымі намаганнямі стварыць на першы час калі не мастацкую, дык дакументальную карціну, адлюстраваўшы на экране багдановіцкія мясціны ў Яраслаўлі, Мінску, Вільнюсе і Ялце. Гэтую прапанову трэба было б ажыццявіць яшчэ сёлета, да юбілея паэта.

Турысты з Беларусі, наведваючы Крым, аглядаюць Місхор, дзе стаіць помнік паэту, прыходзяць на брацкія могілкі, дзе на сёмай алеі пахаваны М. Багдановіч і дзе на помніку высечаны прароцкія словы пра засохлыя зярняткі, якія ўваскрэслі на веснавых палях.

Я. САДОЎСКІ.

АСЕННІ ГАЙ. Фотаэцюд С. ДАРОЖКІ.

З кінакамерай па рэспубліцы

Мінская студыя навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў выпусціла на экраны гарадскіх кінатэатраў і сельскіх клубаў чарговы, дваццаць восьмы нумар кіначасопіса «Савецкая Беларусь», першы сюжэт якога расказвае аб тым, што калектыў Беларускага аўтазавода датэрмінова выканаў абавязацельствы, узятыя ў гонар XXII з'езда КПСС. Цяпер тут створан новы 27-тонны самазвал.

Майстрам высокіх ураджаяў кукурузы прысвечан другі сюжэт кіначасопіса, зняты аператарам Я. Сакаловым у калгасе імя Леніна Слаўгарадскага раёна.

З цікавасцю будуць прагледжаны кінакадры пра Героя Сацыялістычнай Працы, машыніста бульдозера С. Місунова.

Далей у кіначасопісе расказваецца пра выстаўку мастацкай фатаграфіі Італіі ў Мінску, новы дзіцячы камбінат Мінскай фабрыкі імя Калініна.

Асобны кінасюжэт прысвечан першым усебеларускім спартыўным гульням, якія праводзіліся ў Гомелі ў гонар XXII з'езда КПСС.

У заключэнне кіначасопіса гледачы пазнаёмяцца з новай праграмай Мінскага цырка.

Будынкі з-пад зямлі

Ёсць у Навагрудку вельмі цікавае месца — Малы Замак. Тут на працягу апошніх год вядзе раскопкі славяна-лацінскі атрад Інстытута археалогіі Акадэміі навук СССР пад кіраўніцтвам кандыдата геаграфічных навук Ф. Гурэвіч.

Сёлетняя плошча раскопак на так званай тэрыторыі акольнага горада склала 175 метраў.

Асцярожна, дзень за днём, паглыбляліся ў глебу археолагі. І вось на глыбіні амаль трох метраў адкапаны рэшткі глінабітнага дома плошчай 76 квадратных метраў. Тут захаваліся рэшткі глінабітнай печы з цагляным подам. Падлога ў доме была драўлянай і ляжала на глінабітнай аснове. Знойдзены кавалкі аконнага шкла, а пад развалінамі сцен і на падлозе—кавалкі фрэсак, расціснутыя касуды — амфары, абломкі фаянсавага сасуда з люстравым роспісам, залаты пярсцёнак з лацінскім надпісам.

Археолагі ўстанавілі, што гэты будынак загінуў у агні. На ім быў насыпаны слой жвіру таўшчынёй 20 сантыметраў, на якім старажытныя людзі пабудавалі другі будынак.

Усе знаходкі — залатыя рэчы, абломкі амфар, шкляныя вырабы і іншыя характэрны для багатага жылля.

Ленінградскія археолагі выявілі, што ніжняе глінабітнае і верхняе зрубнае жыллё адносяцца да пачатку і сярэдзіны XII стагоддзя.

Раскопкі пацвердзілі вывад, зроблены археолагамі на аснове работы мінулых год: на Малым Замку знаходзіўся акольны горад старажытнага Навагрудка — аднаго з культурных цэнтраў Чорнай Русі. Пачынаючы з XII стагоддзя, акольны горад быў заселены гарадской знаццю. Раскопкі ў Навагрудку будуць працягвацца.

Д. ЗІНГЕР.

Падзеі. Факты. Навіны

□ Севастопальскі драматычны тэатр Чарнаморскага флоту пачаў сёлетні тэатральны сезон прэм'ерай спектакля «Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка.

Севастопальцы цёпла сустрэлі твор беларускага драматурга.

□ Народны тэатр Палаца культуры Віцебскага ўпраўлення мясцовай прамысловасці паказаў прэм'еру п'есы А. Арбузава «Горад на зары». У галоўных ролях заняты слесар Н. Гаруноў, электрык А. Клачко, інжынер В. Кубаленка, швачка Валя Нікіценка, студэнтка музычнага вучылішча С. Скальская і іншыя.

Тэатральныя самадзейныя калектывы Віцебшчыны рыхтуюць звыш двухсот прэм'ер у гонар XXII з'езду КПСС.

□ У мастацкім магазіне-салоне адкрылася выстаўка работ фотааматараў Мінска. Яна арганізавана клубам фотааматараў пры гарадскім Доме народнай творчасці. Сярод прадстаўленых 112 здымкаў прыцягваюць увагу фатаграфіі Н. Максімовіча «Салют», М. Моніча «Пузыр», «У святочны дзень», Г. Меньшыкава «Сябры з Ганы», «Лясы», В. Бархатавай «Праваліла экзамены» і іншыя.

У ВЫДАВЕЦТВАХ ЧЭХАСЛАВАКІІ

⊙ Выдавецтва «Свет Саветаў» у гэтым месяцы выпускае ў свет кнігу першага лётчыка-касманаўта СССР Ю. Гагарына «Дарога ў космас».

⊙ «Клуб чытачоў» — пражскае кніжнае выдавецтва — выдаў раман украінскага пісьменніка Натана Рыбака «Памылка Анарэ дэ Бальзака». Гэтае ж выдавецтва выдала таксама «Песні старога Кітая» — найбольш поўную анталогію кітайскай паэзіі на чэшскай мове.

⊙ Дзве кнігі балгарскага пісьменніка Дзімітра Талева «Жалезны каганец» і «Прэспанскія званы», удастоеныя прэміі Дзімітрава, перакладзены на чэшскую мову ў Дзяржаўным выдавецтве мастацкай літаратуры.

⊙ Дзяржаўнае выдавецтва мастацкай літаратуры выпусціла раман Анны Зегерс «Рашэнне» і кнігу А. Купрына «За славай. Чорная маланка». Упершыню за апошнія сорак год у Чэхаславакіі выдадзены раман Ф. Дастаеўскага «Падлетак».

⊙ Другое выданне рамана вядомага французскага пісьменніка і паэта Луі Арагона «Страсны тыдзень» выйшла ў выдавецтве «Чэхаславацкі пісьменнік».

⊙ Раман венгерскага пісьменніка Л. Местэргазі «Граніца за два крокі» выйшаў у свет у выдавецтве «Наша войска».

⊙ У 1962 годзе выдавецтвы Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі плануюць выдаць многа перакладаў рускіх і савецкіх пісьменнікаў. «Наша войска» рыхтуе да друку творы «Вайна і мір» Л. Талстога, «Жывыя і мёртвыя» К. Сіманава, «Бессмяротная крэпасць» С. Смірнова. Дзяржаўнае выдавецтва мастацкай літаратуры падрыхтавала да выпуску ў 1962 годзе творы А. Пушкіна, А. Астроўскага, раман В. Кажэўнікава «Знаёмцеся, Балуеў» і інш.

Гэта было ў Мінску

Як паведамляе штотыднёвік «Зонтаг», у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы пастаўлен тэлевізійны фільм «Заўсёды на шляху — твой твар». У ім расказваецца пра нямецкага салдата Гэрберта, які ў час апошняй вайны служыў у мінскім гарнізоне. Пад уплывам знаёмства з Соняй, беларускай настаўніцай, Гэрберт зразумеў усю памылковасць нацысцкага шляху. Ён пераходзіць на бок партызан і разам з Соняй вызваляе з фашысцкага засценка беларускага патрыёта Куляшова.

Фільм «Заўсёды на шляху—твой твар» прэміраваны на конкурсе Таварыства германска-савецкай дружбы. Ролю Гэрберта ў фільме выконвае артыст Юрген Фрорып, Соні — польская артыстка Зафія Слабашэўская.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА ЗА МЯЖОЙ

ВАЧЫМА ДРУГА

«Па савецкай зямлі» — так называецца кніга вядомага балгарскага пісьменніка Стаяна Даскалава аб падарожжы па Савецкаму Саюзу. Яна напісана свежа, дасціпна, шчыра, з вялікім пачуццём дружбы да братняй краіны і яе людзей.

Пісьменнік наведаў Азербайджан, Абхазію, Латвію, Маскву, Украіну, Беларусь. Чытача нашай рэспублікі ў кнізе С. Даскалава, вядома, асабліва цікавіць раздзел, прысвечаны Беларусі. Гэты раздзел не выпадкова завецца «Краіна партызанаў». Шчыра захапляецца аўтар партызанскімі справамі беларускага народа ў час Вялікай Айчыннай вайны. «300 тысяч партызанаў! Розум не можа адразу ахапіць гэтую лічбу!»— усклікае аўтар. І ён падрабязна апавядае аб беларускай «партызанскай зоне», якая ў акружэнні ворагаў жыла з савецкімі газетамі, школамі, бальніцамі. Пісьменнік асобна адзначае, што на Беларусі, як і ў Чэхаславакіі, быў знішчаны нямецкі гаўляйтар. З вялікай пашанай гаворыць аўтар кнігі пра беларускіх праслаўленых партызан — Канстанціна Заслонава, дзеда Талаша і іншых, чыё жыццё і барацьба натхнялі беларускіх пісьменнікаў на стварэнне цудоўных твораў. З захапленнем гаворыць аўтар і пра мужных абаронцаў Брэсцкай крэпасці.

Апавядаючы пра Мінск, С. Даскалаў не толькі апісвае яго знешні выгляд, кажучы аб Мінску як аб чыстым, прыгожым, зялёным горадзе, але і праяўляе вялікую цікавасць да яго гістарычных помнікаў.

Аўтар з захапленнем гаворыць пра Мінскі аўтазавод — «надзвычайнае відовішча — індустрыяльны квартал, які размешчаны сярод лясоў».

Найбольш увагі аддаў С. Даскалаў людзям Беларусі. З сяброўскай цеплынёй гаворыць ён пра беларускіх пісьменнікаў. Аўтар падкрэслівае, што сярод членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі многа былых партызан, што ў сваіх творах яны ўславілі кожную пядзю сваёй Радзімы. Многа добрага сказана ў кнізе пра паэтаў Пімена Панчанку, Максіма Танка, Пятра Глебку, празаіка Івана Шамякіна.

Паездка дапамагла яму, падкрэслівае пісьменнік, яшчэ раз пераканацца што савецкія людзі больш за ўсё ненавідзяць вайну і жадаюць трывалага міру і дружбы з усімі, хто шчыра падае ім руку гэтай дружбы: «Але што глыбей за ўсё запала ў душу, — кажа аўтар,—гэта тое, што дзень камунізма блізкі і што, можа, мы дажывём да яго і ў нашай уласнай краіне». Гэтыя заключныя радкі набываюць асаблівае гучанне напярэдадні XXII з'езда КПСС, калі праектам Праграмы КПСС урачыста абвяшчаецца: «Цяперашняе пакаленне савецкіх людзей будзе жыць пры камунізме!»

Кніга «Па савецкай зямлі» — цікавая. І будзе вельмі добра, калі ў бліжэйшы час савецкі чытач і ў прыватнасці чытач Савецкай Беларусі атрымае яе на роднай мове.

Л. ЦІМАШКОВА.

СЫН НОВАГА ВЕКУ

ДА 50-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ АЛБАНСКАГА ПАЭТА МІДЗЬЕНІ

□

Мідзьені — Мілаш Дзьердзь Нікола — нарадзіўся 13 кастрычніка 1911 года ў Шкодры, у сярэднезаможнай гарадской сям'і. Вучыўся будучы паэт у пачатковай школе ў Шкодры, потым у праваслаўнай духоўнай семінарыі ў Бітоле (Македонія). Але, насуперак жаданням свайго дзядзькі, Мідзьені адмовіўся ад папоўскай рызы. У Бітоле ён знаёміцца з ідэямі перадавой літаратуры, захапляецца творамі М. Горкага і Ул. Маякоўскага, якія чытае ў арыгінале. Пазней Мідзьені некаторы час працуе настаўнікам у вёсцы сербскай нацыянальнай меншасці, дзе блізка знаёміцца з жыццём сялян. Тут, у пачатку 30-х гадоў, Мідзьені робіць свае першыя крокі ў літаратуры, піша вершы на албанскай мове.

У пачатку 1935—36 навучальнага года Мідзьені пераязджае ў Шкодэр. Тут ён адрэдагаваў і здаў у друк зборнік «Свабодныя вершы».

Незадоўга да смерці Мідзьені пераехаў у мястэчка Пук, дзе працаваў у школе старшым настаўнікам. К гэтаму часу паэт пачынае набываць вядомасць. Яго творы былі ў цэнтры ўвагі чытачоў, асабліва моладзі.

Памёр Мідзьені 26 жніўня 1938 года ў адным з санаторыяў паблізу Турына.

Літаратурная творчасць паэта працякала галоўным чынам у 1934—36 гадах. За гэтыя гады Мідзьені напісаў свае «Свабодныя вершы» і празаічныя творы, якія пакінулі значны след у албанскай літаратуры.

Выдадзеныя ў 1936 годзе «Свабодныя вершы», распаўсюджанне якіх было затрымана цэнзурай караля Зогу, пачыналіся вершам «Кожны дзень паміраюць багі», які раскрывае матэрыялістычнае светаразуменне былога семінарыста. Непасрэдна за гэтым вершам змешчаны яго «Песні абуджэння», якія заклікалі да паўстання, да звяржэння «багоў», «раз'юшаных тыранаў». Першы верш гэтага цыкла паэт назваў «Сыны новага веку»,—гэта значыць—сыны нашага часу, нашай новай эпохі. Сынам новага веку паэт называе і сябе, заяўляючы:

...Ахопленыя полымем, з гордай
душой,
Гатовыя да смерці, мы рвемся
ў бой
І вырваць перамогу павінны!

Паэт заклікае прыгнечаных скінуць мясцовых «раз'юшаных тыранаў» і італьянскіх фашыстаў, якія глыбока запусцілі свае кіпцюры ў цела роднай Албаніі.

Паэт да канца дзён сваіх верыў у шчаслівую будучыню, у вызваленне краіны і народа.

...Не! Ужо расцвітае свабода
ўдалечыні!
Бачу, сонца ўстае, каб
праменнямі цёплымі
сагрэць нас!

Так піша Мідзьені ў вершы «Непраспяваныя песні». Гэтым сонцам быў для паэта вялікі Савецкі Саюз, адтуль, з усходу, прыйдзе вызваленне і для яго роднай Албаніі.

Другі цыкл «Свабодных вершаў» пачынаецца «Паэмай галечы» — шэдэўрам творчасці Мідзьені, адным з узораў албанскай рэвалюцыйнай паэзіі.

...Не, не спагады просіць!
Аб праўдзе крычыць галеча! —

мужна заяўляе паэт, падымаючы свой голас супраць прыгнятальнікаў, супраць рэлігіі і царкоўнікаў, супраць чорных сіл капіталізму.

Асобна ад другіх вершаў паэт паставіў «Асобую песню», якая складае самастойную частку зборніка. У ёй Мідзьені абрушваецца на фашызм, які ўсё больш падымаў галаву ў Германіі, Іспаніі, Італіі.

Заключаюць зборнік «Юнацкія песні» — гімн новаму жыццю, гімн будучыні.

Мідзьені пісаў і ў паэзіі, і ў прозе. Яго празаічныя творы засталіся раскіданымі па розных выданнях і былі сабраны разам толькі пасля заканчэння нацыянальна-вызваленчай барацьбы і ўстанаўлення народнай улады. Як у вершах, так і ў сваіх празаічных творах — невялікіх сатырычных апавяданнях, «маленькіх аповесцях» — Мідзьені бічуе рэлігію, антыпатрыятычную інтэлігенцыю, правячыя класы, капіталізм, фашызм.

Літаратурная дзейнасць Мідзьені працякала ў цяжкія часы рэжыму Зогу, які ператварыў Албанію ў тавар для фашысцкага італьянскага рынку. Паэт сарваў маску з твару гэтага прадажнага рэжыму і правячых класаў, з рэакцыйных царкоўнікаў і антынароднай інтэлігенцыі, з твару фашызму і імперыялізму. Ён верыў у надыход шчаслівай сацыялістычнай будучыні. Гэтая надзея яго абапіралася на магутны саюз прыгнечаных свету і на пабудову сацыялізма ў СССР.

Мідзьені напісаў мала, яго кароткае жыццё абарвалася надзвычай рана. І ўсё ж яго творы, поўныя рэвалюцыйнага пафасу, маюць і высокую мастацкую вартасць. Сіла яго слова, дакладнасць і ёмістасць думкі спрыялі паспяховаму развіццю крытычнага і сацыялістычнага рэалізму ў албанскай літаратуры.

Гнеўны голас Джона Осбарна

Джон Осбарн — вядучы прадстаўнік літаратурнай групы «разгневаных маладых людзей», аўтар шырока вядомага «Коміка», выклікаў нядаўна ў Англіі сапраўдны скандал. Выступленне пісьменніка надзвычай характэрна для настрояў брытанскай грамадскасці ў апошні час, у час міжнароднага крызісу, які ўзнік у выніку ненармальнага становішча ў Заходнім Берліне.

З паўднёвай Францыі, дзе зараз жыве Д. Осбарн, ён напісаў у лейбарысцкі штотыднёвік «Трыбюн» адкрытае «Пісьмо брытанскаму народу».

«Гэтае пісьмо поўнае нянавісці. Яно адрасуецца вам, мае суайчыннікі. Яно адрасуецца тым, хто прадаў маю краіну. Людзям з пальцамі маньякаў, якія штурхаюць у магілу аслепленае, бездапаможнае і прададзенае цела маёй радзімы. Вы забойцы, і ні аб чым іншым, акрамя гэтага, я не магу думаць... Мне б толькі хацелася, каб усе тыя, хто былі дэмакратычна выбраны ў парламент, папрэлі ў сваіх крэслах у Вестмінстэры, а разам з імі, прынамсі, сем з дзесяці амерыканцаў...

У сваім сэрцы я нашу нож для кожнага з вас, для вас, Макмілан, і асабліва для вас, Гэйтскел...

Будзь ты праклята, Англія. Ты ўся прагніла і хутка зусім знікнеш!»

На голас Д. Осбарна адклікнуліся другія маладыя пісьменнікі Англіі. Джон Брэйн, аўтар кнігі «Шлях наверх», заявіў: «Я згодзен з кожным словам Осбарна, толькі ён павінен быў адрасаваць гэта пісьмо не столькі сваім суайчыннікам, колькі брытанскім палітыкам. Пісьмо выказвае іменна тое, што я адчуваю, калі думаю пра Макмілана, Гэйтскела і пра ўсю гэтую банду».

«Калі б у кожнага з нас быў у сэрцы лёс Англіі, як у Джона Осбарна, нам бы не давялося жыць у бесперапынным крызісе. Свет набліжаецца да катастрофы, і ніхто з нас нават не імкнецца што-небудзь зрабіць. Толькі Джону хапіла мужнасці сказаць тое, пра што думаюць многія людзі»,— так заявіла Шэла Дэлані.

Гэта ж самае падкрэсліў і Арнальд Вескер, заявіўшы: «Гэта пісьмо чалавека, які лічыць, што свет загіне праз некалькі месяцаў. Гэта чалавек са сцятымі зубамі, які, бачачы сваё бяссілле што-небудзь зрабіць, страціў надзею. Сотні тысяч людзей перажываюць тое ж самае».

Аднак цікавей за ўсё рэакцыя брытанскага друку на гэты выбух гневу. Архікансерватыўная «Дэйлі Мейл», якая раней ніколі не прапускала магчымасці для раздування ваеннага псіхозу, прысвяціла пісьму Д. Осбарна перадавы артыкул. Ён канчаецца словамі: «Гэта крык чалавека, які павінен абудзіць краіну, будучы дома... Хай ён выступіць на Трафальгарскай плошчы, як Бертран Расел. Хай піша ў газеты і выступае па тэлебачанню. Хай вылучыць сваю кандыдатуру ў парламент. Ядзерная палітыка надзвычай небяспечная, каб і надалей заставацца ў руках цяперашніх дзеячоў. Таму разумныя людзі павінны публічна выступіць, аказаць максімальны націск на ўрад, самім стаць палітыкамі. Урэшце рэшт лёс міру можа вырашыць толькі сам народ».

Калі і «Дэйлі Мейл» лічыць, што толькі народ здольны ўплываць на лёс міру і папярэдзіць узнікненне ядзернай вайны, калі нават такая газета ўпэўнена, што атамная палітыка надзвычай небяспечна, каб яна па-ранейшаму заставалася ў руках макміланаў і гэйтскелаў, і прапануе, каб «разумныя людзі самі сталі палітыкамі» — значыць, англійскі народ яшчэ скажа сваё слова, слова цвёрдае і канчатковае.

Разгневаны голас Джона Осбарна дасягнуў мэты.

Галоўны рэдактар Нічыпар ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

9 снежня 1961 года **ў Мінску адбудзецца тыраж выйгрышаў**

ГРАШОВА-РЭЧАВАЙ ЛАТАРЭІ

1961 года

(Чацвёрты выпуск).

У тыражы будзе разыграна 200.000 рэчавых і грашовых выйгрышаў на суму 300.000 руб.



Набывайце латарэйныя білеты, удзельнічайце ў тыражы выйгрышаў.

Упраўленне Дзяржпрацашчадкас і Дзяржкрэдыту БССР.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва—3-24- 62, аддзела культуры—3-20-54, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу

АТ 00405

Друкарня імя Сталіна